ДЗЕ ПАЧАСТАВАЦЦА БЕЛАРУСКІМІ БАНАНАМІ 5

ДЗЕД МАРОЗ РАСКАЗАЎ, АБ ЧЫМ МАРАЦЬ ЛЮДЗІ 10

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

31 СНЕЖНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 247 (29114)

З НОВЫМ 2020-м ГОДАМ!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дваццаць разоў па дваццаць
Кожны дзень усміхацца.
Дваццаць разоў па дваццаць
З любымі абдымацца.
Дваццаць разоў па дваццаць
Скрусе не паддавацца.
Дваццаць разоў па дваццаць
Немачы не баяцца.

Дваццаць разоў па дваццаць
Марам усім здзяйсняцца,
А як пачнуць здзяйсняцца —
Дык зноў дваццаць па дваццаць!
Каб мір і лад у хаты,
Каб кожны дзень як свята,
Каб быў на дабро багаты
Новы 2020-ы!

Звяздоўцы — чытачам.

ISSN 1990 - 763X

У найлепшых еўрапейскіх традыцыях

У Беларусі адбыўся першы ў гісторыі Венскі баль

Рабочую рэзідэнцыю Прэзідэнта Беларусі было не пазнаць: яна ператварылася ў сапраўдны палац. Да таго ж, святочны — тут не толькі ўпрыгожаная ёлка, пышныя ложы, доўгія сукенкі дам, станістыя кавалеры і Прэзідэнцкі аркестр, але і месца, дзе пануе шчыры казачны настрой. Ён адчуваўся нават у прэс-цэнтры...

Шматлікія рэпетыцыі не прайшлі дарма. Па традыцыі баль адкрыўся паланэзам дэбютантаў, пасля якога Прэзідэнт пакінуў ложу, каб асабіста павітаць удзельнікаў вечара. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што дзякуючы ім у зале правяць маладосць, талент і прыгажосць. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што год таму напярэдадні навагодніх свят у Палацы Незалежнасці адбыўся першы беларускі баль. Так адрадзілася адна з самых прыгожых танцавальных традыцый, блізкая для беларусаў, якія на працягу многіх стагоддзяў жылі і развіваліся ў самым сэрцы агульнаеўрапейскай культуры.

«Ва ўсе часы палацы з'яўляліся цэнтрам палітычнага і свецкага жыцця, дзе мастацтва на самым высокім узроўні суправаджала многія пратакольныя мерапрыемствы. І ў сучасным свеце яно адыгрывае вялікую ролю, у міжнароднай дыпламатыі асабліва, адкрывае новыя магчымасці для ўмацавання дружалюбных сувязяў паміж народамі і цэлымі дзяржавамі. Вось і сёння, выконваючы пераемнасць праверанага часам палітычнага этыкету, мы праводзім у нашым Палацы першы ў гісторыі сучаснай Беларусі Венскі баль. Але прашу зазначыць — гэта працяг той слаўнай традыцыі, якую мы з вамі адкрылі летась. У яго класічнай, вытанчанай атмасферы працягваем паспяхова пачаты двухбаковы дыялог з нашымі аўстрыйскімі сябрамі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Дарэчы, балю, каб лічыцца Венскім, неабавязкова праходзіць у сталіцы Аўстрыі. Больш важна адпавядаць усім крытэрыям, дакладна прытрымлівацца асаблівага бальнага пратакола. Гэта правіла ЮНЕСКА: Венскі баль унесены ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

На Венскі баль у Палац Незалежнасці былі запрошаны найлепшыя студэнты і старшакласнікі, а таксама прадстаўнікі рабочай моладзі.

«Пра што б вы ні марылі, куды б ні імкнуліся, не забывайце: мы — беларусы і краіна ў нас, радзіма ў нас адна. Захоўвайце сувязь з ёю. Памятайце, калі чалавек адрываецца ад сваіх каранёў, ён страчвае глебу пад нагамі і, самае галоўнае, крыніцу духоўнай сілы. Наша Радзіма, вялікая і малая, менавіта тут. Мы пабудавалі і захавалі суверэнную дзяржаву. І каму, як не вам, надзеі нацыі, вызначаць вектар развіцця на будучыню бліжэйшую і аддаленую. Ад вашых памкненняў залежыць, якой будзе наша краіна», — звярнуўся да ўдзельнікаў балю Прэзідэнт.

І зноў закружыліся пары пад гукі аркестра. Аляксандр Лукашэнка асабіста прыняў удзел у выкананні каралеўскага танца — венскага вальса. Класічная частка бальнай карты ўключае польку, па-дэ-патынэр, галоп і паўночную кадрылю, а таксама гасцявыя нумары, майстар-клас па левабаковым вальсе і бальныя гульні «Паясок» і «Званочкі». Працягнуўся вечар адвольнай праграмай, у якую ўвайшлі ча-ча-ча, румба, самба, павольны фокстрот, і фінальная кадрыля ў выкананні ўсіх гасцей балю, сярод якіх топчыноўнікі і дыпламаты».

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Аўстрыі ў Беларусі Алаізія Вёргетэр ад імя аўстрыйскай дэлегацыі прызнала, што аўстрыйскія традыцыі і любоў да прыгажосці і элегантнасці цудоўна прыжывуцца на беларускай зямлі. Пасол падаравала Прэзідэнту Беларусі хрустальны шар (што па-нямецку гучыць гэтак жа, як «баль») беларускай вытворчасці, напоўнены аўстрыйскімі цукеркамі «Моцарт». Пасол лічыць вельмі сімвалічнай камбінацыю беларускага і аўстрыйскага.

«Вельмі хацелася б, каб Венскі баль вяртаўся, зноў і зноў праходзіў у Мінску», — пажадала Алаізія Вёргетэр.

У адказ Аляксандр Лукашэнка паабяцаў, што Беларусь ад Венскага балю не адмовіцца і такое мерапрыемства будзе праводзіць штогод — з удзячнасцю аўстрыйскаму боку за дапамогу.

Варвара МАРОЗАВА.
Фота БелТА.

ШАЙБУ!

У пятніцу стартуе XVI Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

У спаборніцтве, якое пачнецца на сталічнай «Чыжоўка-Арэне», паўдзельнічаюць 12 камандаў: Кітая, Фінляндыі, Германіі, Расіі, Швейцарыі, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, Украіны, ЗША, зборныя Балкан, Балтыі і IIHF і каманда Прэзідэнта Беларусі.

Пачнецца турнір 3 студзеня матчам Украіна — Швейцарыя на вялікай арэне. Урачыстая цырымонія адкрыцця запланавана ў гэты ж дзень у 17.30. Па інфармацыі прэс-службы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, 5 студзеня ў рамках турніру пройдзе акцыя «Калядная традыцыя», а 6 студзеня знакамітыя гульцы правядуць майстар-клас для ўдзельнікаў рэспубліканскіх спаборніцтваў сярод дзяцей і падлеткаў па хакеі «Залатая шайба».

На Каляды, 7 студзеня, пройдуць фінальныя матчы.

Упершыню ў гісторыі каляднага турніру выручка ад продажу білетаў на вячэрнія матчы будзе накіравана на дабрачыннасць. Сродкі пералічаць у Мазырскі дзіцячы дом. Па інфармацыі, размешчанай на афіцыйным сайце Федэрацыі хакея Беларусі, кошт білетаў на вячэрнія матчы складзе пяць беларускіх рублёў, на ўсе астатнія матчы — уваход свабодны.

Арганізатарамі турніру з'яўляюцца: Рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Прэзідэнцкі спартыўны клуб», Асацыяцыя «Федэрацыя хакея Беларусі», Міністэрства спорту і турызму, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт.

Марыя ДАДАЛКА.

ЯК БУДЗЕ ПРАЦАВАЦЬ ПОШТА Ў ПАЧАТКУ СТУДЗЕНЯ

Прэс-служба РУП «Белпошта» паведаміла, як будуць працаваць паштовыя аддзяленні ў навагоднія і калядныя святы.

Так, 1, 2, 5 і 7 студзеня 2020 года працаваць будуць толькі дзяжурныя аб'екты паштовай сувязі. Усе, хто жадае дакладней даведацца аб рэжыме работы АПС, могуць патэлефанаваць у кантакт-цэнтр РУП «Белпошта» па нумары 154. Звесткі таксама можна ўдакладніць на сайце РУП «Белпошта» ў раздзеле «Навіны кампаніі».

Нагадаем, што ў Беларусі 31 снежня з'яўляецца рабочым днём. 1 студзеня — а з гэтага года і 2 студзеня — выхадныя. Таксама нас чакаюць тры выхадныя дні на праваслаўныя Каляды: 5, 6, і 7 студзеня. За панядзелак, 6 студзеня, беларусы адпрацуюць у суботу, 4 студзеня.

Святлана БУСЬКО.

Надвор'е

СЛІЗКА, ЗАНАДТА СЛІЗКА АДНАК

У першы тыдзень студзеня ўначы невялікі мінус, а ўдзень — слабы плюс

У апошнія выхадныя адыходзячага года ў нашай краіне ўсталяваўся зімовы характар надвор'я. Падмарозіла, у многіх раёнах утварылася снежнае покрыва. Больш за ўсё снегу выпала ў цэнтральных і паўночных раёнах краіны. Але, на жаль, надвор'е нестабільнае і ў панядзелак — аўторак нас яшчэ чакае адліга. Гэта атлантычны цыклон, які ссоўваецца па поўначы Еўропы і прынясе да нас ветранае з ападкамі надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўвечары ў многіх раёнах захаваецца моцны парывісты вецер. Уначы 1 студзеня і раніцай часам чакаецца снег, слабая завіруха. Тэмпература паветра ў навагоднюю ноч складзе ад нуля да мінус 5 градусаў. Удзень у сераду будзе пераважна без ападкаў. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Зноў пацяплее і ўсё пацячэ — будзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла.

Надвор'е не будзе нас радаваць і ў другі дзень новага года. У асобных раёнах у чацвер пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 да плюс 1 градуса, удзень — ад мінус 1 градуса да 5 цяпла. А вось у пятніцу, 3 студзеня, будзе пераважна без ападкаў. Месцамі чакаецца туман, уначы і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, а ўдзень — ад нуля да 6 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу ўначы месцамі, пераважна па паўночным захадзе краіны, удзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 6 градусаў да плюс 1 градуса, удзень будзе ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла. Ці гэта зіма?

Сяргей КУРКАЧ.

ПЕРАДНАВАГОДНІЯ ЧАРОЎНЫЯ ІМГНЕННІ...

падарылі дзецям па ўсёй краіне!

У абласных цэнтрах прайшлі дабрачынныя мерапрыемствы з удзелам кіраўнікоў рэгіянальнай вертыкалі ўлады. Па традыцыі на святочныя перадновагоднія «губернатарскія» ёлкі запрашаюць таленавітых і адораных дзяцей, тых, хто мае спартыўныя дасягненні, а таксама малых са складаным лёсам — з апякунскіх сем'яў і дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Галоўная мэта — падарыць дзеткам пачуццё радасці і цудоўныя імгненні, з якімі асацыюцца навагоднія святы!

Фота Нэлі ЗІГУЛЯ.

Множыць добрыя справы —

такое пажаданне прагучала на абласным дабрачынным свяце ў Брэсце

У абласным Цэнтры маладзёжнай творчасці было надзвычай шумна і весела. Тут працавалі гульнявыя пляцоўкі, была разгорнутая выстаўка дзіцячай творчасці «Вясёлкавы калейдаскоп». Вернісаж уражваў разнастайнасцю і глыбінёй таленту юных аўтараў.

На свята атрымалі запрашэнні 370 дзяцей з усіх раёнаў вобласці. У іх ліку — дзеці-сіроты, дзеці, якія засталіся без бацькоўскай апекі, а таксама хлопчыкі і дзяўчынкі з малазабяспечаных, шматдзетных і няпоўных сем'яў, пераможцы прадметных алімпіяд, шматлікіх конкурсаў, актывісты школьнага самакіравання.

Гэтае свята яшчэ называюць «губернатарскай» ёлкай, бо павіншаваць дзяцей з новым годам па традыцыі прыходзіць кіраўнік рэгіёна. І гэтым разам **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС** пажадаў дзецям, каб яны былі здаровыя, а таксама здароўя і дабрабыту іх бацькам і тым, хто іх замяніў.

Кіраўнік вобласці пажадаў дзецям быць карыснымі людзям і грамадству, любіць свой край, множыць добрыя справы і ўчынкі. Ну а потым завіравала «ёлка» — пачалася навагодняя дзея з танцамі, песнямі, карагодамі, конкурсамі. Ну і вядома, ніхто не застаўся без падарунка.

Сустрэліся юныя таленты

Каля тысячы юных жыхароў Віцебскай вобласці было запрошана ў канцэртную залу «Віцебск» на навагоднее прадстаўленне з удзелам губернатара. Гэтыя хлопчыкі і дзяўчынкі — пераможцы прадметных алімпіяд, спартыўных спаборніцтваў і розных творчых конкурсаў, кадэты, а таксама выхаванцы дамоў-інтэрнатаў.

Яны ўбачылі спектакль пра навагоднія цуды ў краіне кніжак, сталі вучнямі імправізаваных майстар-класаў па вырабе сувеніраў, патанцавалі на святочнай дыскатэцы.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ на галоўнай ёлцы пажадаў дзятве і падлеткам быць актыўнымі па жыцці, мужна пераадольваць цяжкасці. І гэта, безумоўна, дазволіць дабіцца поспехаў. Ён падкрэсліў: тымі, хто знаходзіцца ў зале, ужо ганарыцца Віцебшчына. Але спыняцца на дасягнутым нельга, трэба падвышаць планку поспехаў, каб яны праслаўлялі нашу краіну, у якой робіцца ўсё для падтрымкі юных талентаў.

У сваю чаргу, дзеці падарылі губернатару сувеніры, у тым ліку і сімвал новага года.

Сапраўдная зіма ў падарунак

Старшыня Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта Генадзь САЛАВЕЙ павіншаваў найлепшых школьнікаў рэгіёна

Галоўная ёлка вобласці ў рамках дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» сабрала каля 1,5 тысячы школьнікаў у Гомельскім дзяржаўным цырку. Запрашэнні атрымалі дзеці, якія дасягнулі поспеху ў вучобе, творчасці, спорце, а таксама хлопцы і дзяўчаты з малазабяспечаных сем'яў і дзеці-сіроты.

«Мы ганарымся дзецьмі Гомельскай вобласці, яны ўносяць свой каштоўны ўклад у развіццё і сферы адукацыі і рэгіёна. Многія дзеці сваёй упартасцю і працай, дасягненнямі і здзяйсненнямі ўслаўляюць рэгіён», — перадае словы Генадзя Салаўя БелТА.

Старшыня аблвыканкама расказаў, што дзяржава сёння робіць многае, каб дзеці адчувалі сябе камфортна, маглі развіваць здольнасці і таленты.

Генадзь Салавей разам з прысутнымі загадаў адно агульнае жаданне — каб Дзед Мароз прынёс сапраўдную зіму, са снегам і падбадзёрлівым марозікам.

Старшыня аблвыканкама падчас свята таксама ўручыў узнагароды 10 школьнікам, якія сталі пераможцамі разнастайных конкурсаў і спаборніцтваў.

Гэта яскравая падзея!

На самым маштабным навагоднім свяце для дзяцей было паказана лазернае шоу

grodnonews.by.

Упершыню «губернатарская» ёлка прайшла ў адноўленай абласной філармоніі. Дзякуючы вялікай зале падзея з удзелам старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра КРАЎЦОВА атрымалася надзвычай масавай і яскравай.

У складзе тых, хто быў запрошаны на гэта цудоўнае свята, — школьнікі, якія выдатна праявілі сябе ў вучобе, спорце, творчасці, таксама выхаванцы цэнтраў карэкцыйнага развіцця і інтэрнатаў, дзеці са шматдзетных сем'яў. Ніхто з іх не сумаваў, бо ўжо ў фае гасцей сустракалі казачныя персанажы, якія вадзілі карагоды каля прыгажуні-ёлкі. Але галоўнае прадстаўленне чакала дзяцей у зале філармоніі, дзе для іх была падрыхтавана феерычная навагодняя праграма. Перад пачаткам прадстаўлення дзяцей павіншаваў Уладзімір Краўцоў.

Добрым навагоднім падарункам стаў для прысутных эстрадны музычны спектакль ад артыстаў абласной філармоніі. Захапляльнае лазернае шоу, інтэрактыўныя гульні, пясочная анімацыя і многае іншае — усё гэта надоўга запомніцца юным гродзенцам.

Таленавітыя і паспяховыя

Болей чым 600 школьнікаў вобласці ўзялі ўдзел у «губернатарскай» ёлцы ў Магілёве

Удзельнікамі дабрачыннага свята сталі выдатнікі вучобы, пераможцы алімпіяд, конкурсаў і спаборніцтваў, лідары і актывісты, дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, навучэнцы кадэцкага вучылішча, выхаванцы «SOS — Дзіцячай вёскі Магілёў» — усяго больш за 600 хлопчыкаў і дзяўчынак з усёй вобласці. Павіншаваць іх прыйшлі прадстаўнікі мясцовай улады на чале з губернатарам Магілёўскай вобласці Леанідам ЗАЙЦАМ, а таксама дэпутаты парламента.

А потым быў святочны карагод вакол вялікай ёлкі Палаца культуры вобласці, а таксама захапляльнае інтэрактыўнае падарожжа па матывах вядомых літаратурных твораў. Усе ўдзельнікі свята атрымалі салодкія падарункі, а таксама гранд-падарунак ад старшыні Магілёўскага аблвыканкама, які сабралі найлепшыя кандытары булачна-кандытарскай кампаніі «Дамачай». Мерапрыемства адбылося ў рамках навагодняй акцыі «Нашы дзеці!»

«Навагодні экспрэс» і парад Дзедаў Марозаў

Васемсот пяцьдзясят юных грамадзян з усіх куткоў Міншчыны сабраліся ў Барысаве на навагоднее абласное свята 28 снежня. Гэта пераможцы раённых і абласных алімпіяд, разнастайных конкурсаў і спаборніцтваў, выдатнікі вучобы, лідары грамадскіх арганізацый, дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў. Дабрачыннае мерапрыемства адкрыў старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.

Падчас свята хлопчыкі і дзяўчынкі акунуліся ў чароўную атмасферу тэатралізаванага казачнага прадстаўлення «Мы сустракаем Новы год». Салодкія падарункі ім уручылі прадстаўнікі Мінаблвыканкама і Барысаўскага райвыканкама. Акрамя таго, дзеці з усіх раёнаў Міншчыны зрабілі ўнікальныя фотазоны, аб'яднаныя ў «Навагодні экспрэс». Малыя імкнуліся адлюстраваць спецыфічныя асаблівасці сваёй малой радзімы, паказаць яе адметнасць і непаўторнасць. Дзеці паўдзельнічалі таксама ў шоу мыльных бурбалак, цікавых віктарынах і конкурсах, інтэрактыўных гульнях, вясёлых карагодах.

У гэты ж дзень у Барысаве адбыўся абласны парад Дзедаў Марозаў, Снягурак і казачных персанажаў.

Для самых маленькіх

У Дзівінскі дзіцячы дом у Кобрынскім раёне прыехаў старшыня рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Прэзідэнцкі спартыўны клуб» Дзмітрый ЛУКАШЭНКА, каб прыняць удзел у акцыі «Нашы дзеці». Сын кіраўніка дзяржавы завітаў у дзівінскую ўстанову разам з жонкай і дочкамі, каб падтрымаць тых дзяцей, якія маюць у гэтым найвялікшую патрэбу.

Ва ўстанове цяпер выхоўваецца 29 хлопчыкаў і дзяўчынак ад 3 да 18 гадоў. Бацькі большасці з іх пазбаўлены правоў на выхаванне дзяцей. А дзеці, як і ўсе іх равеснікі, чакаюць Новага года, пішуць лісты Дзеду Марозу, вераць у цуд. У многім здзейсніцца іх марам дапамаглі госці. Асаблівы акцэнт зроблены на падарунках для самых маленькіх. Сёлета ў дзіцячым доме адкрылася дашкольная група. Установа атрымала гульні і цацкі для развіцця, а таксама патрэбную ў гаспадарцы газонакасілку.

Свята для падшэфных

Міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ у межах дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» наведаў прыватную сацыяльна-педагагічную ўстанову «SOS — дзіцячая вёска «Мар'іна Горка» ў Пухавіцкім раёне.

— Мы вельмі чакалі нашага паважанага госця з яго камандай, — прызналася перад пачаткам свята **намеснік дырэктара ўстановы Іна МЯЛЕШКА.** — Нашы дзеці добра ведаюць Аляксандра Мікалаевіча, бо Міністэрства інфармацыі нас курыруе, яго супрацоўнікі прыязджаюць да нас на працягу некалькіх гадоў, удзельнічаюць у розных мерапрыемствах.

— У нашай краіне існуе добрая традыцыя — напярэдадні Новага года праводзіць дабрачынную акцыю для дзяцей, якую ініцыяваў кіраўнік дзяржавы. І яна з году ў год набірае розныя фарматы, павароты. Усе, хто мае магчымасць, аказваюць падтрымку дзецям, асабліва дзецям, якія знаходзяцца ў складаных умовах у параўнанні з тымі, што пастаянна выхоўваюцца ў сям'і. SOS-вёскі — гэта самы цікавы праект дзяржаўна-прыватнага супрацоўніцтва ў сацыяльнай сферы. І Міністэрства інфармацыі вельмі ўважліва ставіцца да развіцця гэтага аб'екта, да развіцця гэтай вёскі, тых дзяцей, якія ходзяць у дзіцячы садок або вучацца ў мясцовых школах. Мы прыехалі сёння з падарункамі, хочам, каб у нашых падшэфных было свята. Мы таксама будзем максімальна спрыяць таму, каб розныя міжнародныя стасункі тут развіваліся. Іх сёння шмат. Дзеці актыўна займаюцца спортам, ездзяць са сваёй футбольнай камандай па ўсім свеце, і вельмі прыемна, што мясцовыя ўлады падтрымліваюць іх. А наш абавязак — дапамагчы, паспрыяць ініцыятывам выхаванцаў, іх настаўнікаў, — лічыць Аляксандр Карлюкевіч.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Аляксандр ПУКШАНСКІ,
Маргарыта УШКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ,
Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

2019-ы ў цытатах Прэзідэнта

Увесь адыходзячы год карэспандэнты аддзела палітыкі «Звязды» працавалі ў пуле лідара дзяржавы. Наша аўдыторыя магла чытаць на старонках і на сайце газеты эксклюзіўныя артыкулы з камандзіровак Аляксандра Лукашэнкі па Беларусі, нарад і сустрэч у Палацы Незалежнасці і іншых знакавых мерапрыемстваў з удзелам кіраўніка краіны. У гэтым навагоднім нумары мы вырашылі крыху адысці ад афіцыйнага стылю «другапалосных» артыкулаў і падрыхтавалі для вас падборку самых яркіх, цікавых (на наш погляд) цытат Прэзідэнта ў 2019 годзе, якія, адпаведна, азначалі і знакавыя для краіны падзеі.

«Усцэлым у выбраным парламенце прадстаўлены і адлюстраваны інтарэсы ўсіх слаёў насельніцтва»

Галоўная палітычная падзея года — выбары ў парламент — прайшла без эксцэсаў. Гэта былі вымушаны адзначыць нават назіральнікі ад АБСЕ. Урэшце, было б дзіўна, каб іх справаздача засталася без заўваг... Урэшце, як сказаў кіраўнік дзяржавы, выбары мы праводзім для сваёй краіны, для свайго народа, каб было лепш у нас.

Выбары адбыліся, ужо прайшла першая сесія абедзвюх палат Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання, але не забываюцца і поспехі дэпутатаў і сенатараў, якія працавалі ў папярэднім скліканні. Некаторыя нават былі ўдастоены дзяржаўных узнагарод — а іх, вядома, у нашай краіне проста так не раздаюць.

Парламентарыі сёмага склікання таксама, відавочна, увойдуць у гісторыю Беларусі: ім давядзецца падключыцца да работы па ўдасканаленні Канстытуцыі. Прынамсі, Прэзідэнт такую задачу паставіў.

«Такія моманты яднаюць народы, а значыць, вялікая алімпійская місія даваць арэны для мірнага, сумленнага саперніцтва атлетаў і дзяржаў заўсёды будзе актуальнай і запатрабаванай»

2019-ы стаў часам яскравых перамог. Яшчэ на адкрыцці II Еўрапейскіх гульняў Аляксандр Лукашэнка прапанаваў разам на карысць чалавецтва перанесці ўсе сучасныя палітычныя баталіі на спартыўныя пляцоўкі.

«Давайце толькі так — праз спорт — спаборнічаць за тытул самай моцнай дзяржавы», — пажадаў Прэзідэнт. А сяброў-сапернікаў перасцярог: на наступнай еўрапейскай алімпіядзе беларусы выступяць самым моцным складам. Трымайцеся, суседзі! Гэта на дамашніх пляцоўках мы, як гасцінныя гаспадары, саступілі першынство.

Турнір па пляжным футболе падчас II Еўрапейскіх гульняў прызнаны найлепшай падзеяй года ў гэтым відзе спорту. А прэзідэнт Еўрапейскіх алімпійскіх гульняў увогуле адзначыў нашы Гульні як найбольш яскравую спартыўную падзею года. Яшчэ б: больш за чатыры тысячы атлетаў з 50 краін разыгралі дзвесце камплектаў узнагарод у 15 відах спорту.

Ну і дэбет з крэдытам у канцы года звесці трэба: за час бязвізу на II Еўрапейскіх гульнях замежныя госці правялі аперацый па картках больш чым на 236 мільёнаў рублёў, а ўсяго нашу краіну наведала каля 37,5 тысячы турыстаў.

Шэраг значных спартыўных падзей у пачатку верасня завяршыў матч Еўропа — ЗША, які стаў сапраўды гістарычнай падзеяй. Матч — працяг традыцыі легендарных лёгкаатлетычных спаборніцтваў паміж СССР і ЗША, якія праходзілі з 1958 да 1985 года па чарзе ў гарадах дзвюх дзяржаў. У тыя гады выказванне «О спорт, ты — мір!» было актуальнае як ніколі. Падчас «халоднай вайны» матчавыя сустрэчы СССР — ЗША станавіліся прыкладам сумленнай барацьбы толькі на спартыўных пляцоўках і сімвалам імкнення да палітычнай раўнавагі і мірнага саперніцтва паміж дзяржавамі.

У 2021 годзе матч па праве чаргі павінен адбыцца ў ЗША, але ў гэтай краіне будзе праводзіцца і чэмпіянат свету па лёгкай атлетыцы. Звяртаючыся з прамовай да прысутных на адкрыцці спаборніцтваў на стадыёне «Дынама», Прэзідэнт прапанаваў арганізатарам правесці іх яшчэ раз у Беларусі і жартам паабяцаў, што праз два гады Мінск стане сталіцай Злучаных Штатаў Амерыкі.

«Удакладняю, каб не западозрылі ў нядобрым, нібыта мы Амерыку хочам далучыць. На гэтыя дні, калі вы нам даверыце, Мінск стане сталіцай ЗША, таму што ЗША павінны праводзіць гэты матч. З Дональдам Трампам мы дамовімся», — растлумачыў сваё выказванне лідар краіны. Дарэчы, па выніках спаборніцтваў перамога засталася за атлетамі з Еўропы.

«Малыя і сярэднія дзяржавы, такія як Беларусь, могуць унесці рэальны ўклад у адраджэнне «духу Хельсінкі» на еўрапейскай прасторы»

Пра бяспеку сёлета размаўлялі шмат і на розных мовах: увосень у Мінску прайшлі адразу дзве міжнародныя канферэнцыі — «Барацьба з тэрарызмам пры дапамозе інавацыйных падыходаў і выкарыстання новых і ўзнікаючых тэхналогій» і «Еўрапейская бяспека: адысці ад краю прорвы», больш вядомая як «Мінскі дыялог».

Беларусь заўсёды выступала донарам стабільнасці, пастаўшчыком і еўрапейскай, і міжнароднай бяспекі. Хто б што ні казаў, у нашай дзяржаве бачаць надзейнага партнёра, які карыстаецца даверам і Усходу, і Захаду. Дык дзе, як не ў Беларусі, шукаць адказу на пытанне, ці можна пабудаваць наш агульны дом бяспечным і стабільным?

І адказ гэты станоўчы. Прынамсі, Прэзідэнт заявіў, што Беларусь ініцыюе распрацоўку і прыняцце шматбаковай палітычнай дэкларацыі адказных краін аб неразмяшчэнні ракет сярэдняй і меншай далёкасці ў Еўропе, бо хутка свет можа апынуцца ў сітуацыі, калі адносіны ў сферы ядзерных узбраенняў не будуць кантралявацца ўвогуле нічым. «У ідэале нам трэба вярнуцца да канцэпцыі еўрапейскай бяспекі, заснаванай на супрацоўніцтве», — сказаў тады беларускі лідар. Бо ніхто не цэніць мір так, як беларусы і славяне ўвогуле.

Сёлета Беларусь адсвяткавала 75-годдзе вызвалення, а налета СНД адзначыць 75-годдзе Вялікай Перамогі. Зварот краін-удзельніц СНД да народаў Садружнасці і сусветнай грамадскасці ў сувязі з юбілеем прыняты на саміце ў Ашгабаце. Тады на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Перамога савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне адзіная і недзялімая.

«Нам выпала вялікае шчасце ўзяць наш квітнеючы Брэст за руку і ўвесці яго ў новае тысячагоддзе»

З такім пасылам Прэзідэнт звярнуўся да жыхароў Брэста, які 6 верасня адзначыў свой 1000-гадовы юбілей. На свята Аляксандр Лукашэнка прыехаў з выдатным падарункам, пра які гараджане маглі толькі марыць. Дырэктар музея гісторыі Брэста Святлана Тамчук з рук кіраўніка краіны прыняла арыгінальны экзэмпляр Брэсцкай Бібліі. Пісанне было надрукавана ў 1563 годзе колькасцю 500 экзэмпляраў. З цягам часу засталося каля сотні рарытэтных кніг, адна з якіх праз амаль пяць стагоддзяў вярнулася дадому.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта падзея стала магчымай дзякуючы бізнесменам, якія выкупілі ўнікальную кнігу за мяжой. Але гэта не адзіны падарунак гораду да міленіума. Падчас візіту ў Брэст Прэзідэнт перарэзаў чырвоную стужку, адкрыўшы рух па Заходнім абыходзе абласнога цэнтра. Пуцепровод пабудаваны за тры гады з выкарыстаннем унікальных тэхналогій.

Асаблівае месца займае старажытны горад і ў лёсе самога Аляксандра Лукашэнкі. З Брэстчынай у яго звязаныя асаблівыя ўспаміны, тут будучы кіраўнік дзяржавы служыў у войску, у пагранічным атрадзе. Па яго словах, каб не тая школа армейскага жыцця, то наўрад ці ён выступаў бы на свяце горада ў сваёй цяперашняй якасці.

«Прыходзьце, будзем працаваць. Прыходзьце ў бяспечную краіну, дзе высокакваліфікаваныя людзі, дзе людзі адказныя, якія напакутаваліся за ўсю сваю гісторыю і ўмеюць цаніць зароблены цэнт, рубель, еўра або капейку»

На такі прынцып работы ў Беларусі Прэзідэнт накіраваў прадпрымальнікаў Аўстрыі. Беларуска-аўстрыйскі бізнес-форум, на якім Аляксандр Лукашэнка выказаўся такім чынам, адбыўся з нагоды яго афіцыйнага візіту ў федэратыўную рэспубліку. Камандзіроўку ў Аўстрыю многія называюць прарывам, бо доўгі час з-за санкцый адносіны паміж Еўрасаюзам і нашай краінай нельга было назваць трапяткімі. Але нават у тыя часы супрацоўніцтва Мінска і Вены ніколі не перарывалася, таму для першага паўнацэннага прэзідэнцкага візіту ў ЕС прынялі запрашэнне менавіта аўстрыйцаў.

«Мы ніякім суверэнітэтам не дзелімся. Ні Расія, ні Беларусь»

Пра недатыкальнасць суверэнітэту і незалежнасці Беларусі Прэзідэнт у бягучым годзе казаў вельмі часта. У тым ліку і ў інтэрв'ю галоўнаму рэдактару «Эхо Москвы» Аляксею Венедзіктаву, большасць пытанняў якога датычылася беларуска-расійскіх адносін. За год эксперты налічылі амаль з дзясятак сустрэч лідараў дзвюх краін. Асноўныя пытанні, якія стаяць на парадку дня Саюзнай дзяржавы, — кошт энерганосьбітаў (нафты і газу) і ўзгадненне распрацаваных рабочай групай 31 дарожнай карты інтэграцыі. Асноўныя пазіцыі нашай краіны (як і суверэнітэт непарушныя): Саюзнай дзяржаве — саюзныя ўмовы, як на баралі так і на кубаметры.

Марыя ДАДАЛКА, Варвара МАРОЗАВА.

Ну і ну!

Мандарыны, апельсіны, бананы... беларускія

Своеасаблівая «фішка» для турыстаў, ды і тутэйшых, у Чашніцкім раёне — прыватная аранжарэя плошчай больш за 1200 «квадратаў». Тут вырошчваюць адзін з сімвалаў навагодняга свята — мандарыны. Недалёка можна ўбачыць, як растуць бананы, лімоны, персікі, інжыр, кафейнае дрэва, іншая экзотыка. У штучным вадаёме плаваюць асятры, якіх пры жаданні гасцей могуць прыгатаваць. А ў клетцы спявае кенар. Знаходзіцца ўсё гэта ў аграрнай сядзібе «Абузер'е».

Побач вялікае возера каля Лукомльскай дзяржаўнай раённай электрастанцыі — флагмана беларускай энергетыкі. Вадаём па плошчы адзін з пяці найвялікшых у Беларусі. Многія яго параўноўваюць з морам, дзе заўсёды шмат рыбы. Таму любяць тут спыняцца і заядлыя рыбакі.

Ад Віцебска да вёскі Абузер'е на аўтамабілі прыкладна паўтары гадзіны, ад Мінска — прыкладна дзве, а масквічам ехаць — меней шасці гадзін.

Гаспадыня турыстычнага пункта Ларыса Іванова па адукацыі спецыяліст па міжнародных стасунках. Дарэчы, што цікава, яна нарадзілася і доўгі час жыла ў Расіі: у Ханты-Мансійскай аўтаномнай акрузе, а вучылася ў Санкт-Пецярбургу — у акадэміі дзяржаўнай службы.

— У Беларусь прыязджалі да сваякоў мужа Вячаслава адпачыць. Каля дзесяці гадоў таму мы пабудавалі ў вёсцы дом і «дачу», каб прымаць у гасцях расійскіх сваякоў, знаёмых. Тыя шчыра дзяліліся ўражаннямі са сваімі сябрамі. І многія таксама хацелі адпачыць у беларускай глыбінцы, набрацца сіл на прыродзе, харчуючыся агароднінай, садавіной без хімікатаў. І тая ж тэмпература: плюс 20 градусаў. І паралельна — неабходны стабільны ўзровень вільготнасці. За яго адказвае вельмі прадуманая і разумная сістэма кандыцыянавання.

Усяго пад дахам на дванаццаці сотках больш за пяцьдзясят відаў флоры. Пры гэтым у памяшканні вельмі прасторна. Тут з задавальненнем бегаюць дзеці, гуляюць у схованкі, катаюцца на маленькіх веласіпедах, самакатах. Ёсць і горкі, арэлі...

Як жа навучылася даглядаць экзатычныя расліны? Ларыса кажа, што дзякуючы сеціву можна атрымаць шмат рэкамендацый па ўсіх тэмах. Але, як сцвярджае гаспадыня «зялёнага царства», найлепшая парада — напрацаваны гадамі вопыт.

Як «бонус» — багатыя ўраджаі смачных і вельмі карысных для здароўя пладоў. А як пахнуць і якія цудоўныя на смак аранжарэйныя бананы, апельсіны і мандарыны... Словамі не перадаць. А сокі з іх, кажуць, толькі б піць ды піць.

Дарэчы, частка ўраджаю прадаецца. Аднавяскоўцы і госці ахвотна купляюць тыя ж беларускія бананы. Канешне, гучыць, бадай, смешна, але факт застаецца фактам.

— Уявіце сабе: адна гронка вагой пад дваццаць кіло! А ўраджай персікаў бывае і пад трыста кілаграмаў. Сотні кіло мандарынаў, лімонаў, апельсінаў — самім не з'есці ніколі пры ўсім жаданні, — канстатуе вясковая бізнесвумен.

І амаль усе прыезджыя ўпершыню ў жыцці дзякуючы Ларысе паспрабавалі на смак каламондзіны — гэта гібрыдная расліна: мандарынавае дрэва з кумкватам (з роду цытрусавых)...

Ларыса яшчэ і двойчы мама: дачцэ Жанне — сем, сыну Ваню — пяць гадоў. Ім, безумоўна, вельмі пашанцавала жыць побач з «тропікамі». Малым вельмі падабаецца паліваць кветкі, садавіну, ягады. Каб вады ўсім даць, падрэзаць і абрэзаць лішняе, падкарміць, падлячыць, рабочай змены не хапае. У прыватнасці, доўгі працэс паліву. Некаторым раслінам дастаткова трохі вады, а асабліва «капрызным» неабходны «душ» са шлангу. Ды яшчэ некаторых без лесвіцы не памыць.

Таму ёсць у працавітай Ларысы тры памочнікі. Яны ж і прыёмам турыстаў займацца дапамагаюць.

Аграрная сядзіба больш нагадвае комплекс, бо прыезджыя адпачываюць у некалькіх катэджах. За год тут бывае і пад тысячу гасцей. Напэўна, другой такой сядзібы не знайсці не толькі на Віцебшчыне, але і ва ўсёй краіне.

Напрыклад, на дварэ класічнае навагоднее надвор'е: з марозцам і сняжком, а за шклом аранжарэі клімат зусім іншых геаграфічных шырот. Дзе яшчэ ўбачыш такі «звычайны цуд»? Такое не забываецца насамрэч доўга. І фотаздымкі на памяць хочацца глядзець і глядзець.

Так і распачалі сямейны турыстычны бізнес, — жанчына згадвае, як усё пачыналася.

У прынцыпе, пачатак такі, як і ва ўсіх уладальнікаў беларускіх аграсядзіб. Канешне, паспрыяў старту бізнесу сімвалічны падатак для тых, хто займаецца сельскім турызмам, — усяго базавая велічыня ў год.

Наконт аранжарэі гаспадыня кажа, што напачатку быў проста агарод, як ва ўсіх вяскоўцаў ці дачнікаў.

— Але захацелася, каб расліны радавалі вока круглы год. Вось і пабудавалі вялікую аранжарэю. Каб у ёй было ўсім раслінам утульна, заўсёды падтрымліваецца адна

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота Ігара МАЦВЕЕВА.

Сведения о результатах проведения Рекламной игры «Выбирай и выигрывай»

Сведения об организаторе:
Белорусско-эстонское совместное предприятие «ПРАЙМЭРИ» общество с ограниченной ответственностью с местом нахождения по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2. УНП 101132766.

Наименование Рекламной игры:
«Выбирай и выигрывай».

Срок начала и окончания Рекламной игры:
Срок начала Рекламной игры – 1 ноября 2019 года;
Срок окончания Рекламной игры – 15 января 2020 года.

Сведения о государственной регистрации Рекламной игры:
Рекламная игра зарегистрирована Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 28 октября 2019 года, свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 3668.

Сведения о количестве участников рекламной игры:
В Рекламной игре приняло участие 1056 человек.

Сведения о розыгрыше призового фонда:
Призовой фонд Рекламной игры разыгран полностью.

Фамилии и инициалы победителей, их выигрыши:
По одному Еженедельному призу, включающему в себя Печенье песочное TWIX с карамелью, покрытое молочным шоколадом 55 граммов, 40 штук в упаковке, стоимостью 32,12 (тридцать два) белорусских рубля 12 копеек, выиграли:

№ п/п	Ф. И. О. Победителя
1	Кондратьев М. А.
2	Дыро В. И.
3	Ерофеева Я. А.
4	Габинет Е. О.
5	Сивицкая Н. М.
6	Штоп А. В.
7	Шаповалов Е. В.
8	Деркач Н. Е.
9	Бурко В. Г.
10	Махнач С. С.
11	Минкевич Т. М.
12	Лебедева Д. А.
13	Микулич Е. Д.
14	Чеховская Н. П.
15	Литвинко П. М.
16	Левицкая Н. С.

По одному Еженедельному призу, включающему в себя Сертификат на горячий напиток в кофейне «Coffee Wanted», срок действия сертификата с 4 ноября 2019 года по 31 января 2020 года, стоимостью 5 (пять) белорусских рублей 00 копеек, выиграли:

№ п/п	Ф. И. О. Победителя
1	Клепча О. В.
2	Дыро А. М.
3	Павлють Т. С.
4	Хвин М. В.
5	Захарова А. А.
6	Щиглинская Т. Б.
7	Механикав В. Н.
8	Осипов Д. В.
9	Карунахаран М. Е.
10	Мохлянкина В. В.
11	Котлярова И. Н.
12	Вепринский Я. М.
13	Чернова Т. Г.
14	Докучиц Н. А.
15	Карпук С. И.
16	Шваяков А. В.

По одному Еженедельному призу, включающему в себя Френч-пресс Aurora AU8006, стоимостью 16,80 (шестнадцать) белорусского рубля 80 копеек, выиграли:

№ п/п	Ф. И. О. Победителя
1	Бохан А. А.
2	Осипенко М. В.
3	Деркач К. С.
4	Лескова Ю. Б.
5	Лещевич В. И.
6	Шукало В. К.
7	Егорова Е. И.
8	Войно Е. К.
9	Залевский С. Н.
10	Лупарева И. В.
11	Шенец Т. В.
12	Травкина А. В.
13	Пацко Т. С.
14	Леонова Л. И.
15	Осипенко Т. И.
16	Пашкова О. С.

По одному Еженедельному призу, включающему в себя Термокружку Peterhof 0,4 литра, цвет красный, стоимостью 21,90 (двадцать один) белорусского рубля 90 копеек, выиграли:

№ п/п	Ф. И. О. Победителя
1	Кондратьева О. В.
2	Царева О. Д.
3	Лысковская А. С.
4	Лесков Е. В.
5	Лудик Т. Н.
6	Карпека М. А.
7	Бархатов В. В.
8	Логацкая О. И.
9	Страшнева Н. С.
10	Главинский Д. И.
11	Ленькова Л. Л.
12	Черная Т. А.
13	Борисова Н. А.
14	Вергейчик М. В.
15	Соколовская Ю. Б.
16	Доленко Е. И.

По одному Еженедельному призу, включающему в себя Банку для сыпучих продуктов металлическую, размер 10,7 х 10,7 х 16,1, стоимостью 10,27 (десять) белорусского рубля 27 копеек, выиграли:

№ п/п	Ф. И. О. Победителя
1	Худолей У. Ю.
2	Конопелько К. Е.
3	Кореневская О. Ю.
4	Соловьева К. П.
5	Анисимова Е. А.
6	Сандригайло Т. И.
7	Азявчикова Н. А.
8	Галко О. С.
9	Коханская М. В.
10	Шрамова С. С.
11	Левицкий А. С.
12	Барнюк В. В.
13	Сыч П. Н.
14	Клепча Е. Ю.
15	Волкович М. В.
16	Храповицкая Л. В.

По одному Дополнительному призу, включающему в себя два подарочных сертификата 21vek + стоимостью по 500,00 белорусских рублей каждый, действительные до 14.10.2020 г., а также денежные средства в размере 129,85 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза, выиграли:

№ п/п	Ф. И. О. Победителя
1	Дыро А. М.
2	Лесков Е. В.
3	Кондратьева О. В.
4	Микулич Е. Д.
5	Дыро В. И.
6	Хрупкин П. А.
7	Кондратьев М. А.

По одному Главному призу, включающему в себя денежные средства в размере 5000 белорусских рублей, а также денежные средства в размере 727,55 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза, выиграли:

№ п/п	Ф. И. О. Победителя
1	Кондратьев М. А.
2	Гордеюк А. О.

Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры: +375 17 239 07 19.

Сёлета мы сталі бацькамі двойчы

У нашай адносна маладой сям'і прыжылася добрая традыцыя: кожны год, пачынаючы з першага студзеня, мы з мужам на рознакаляровых паперках і коратка апісваем усе радасці і прыемнасці, якія адбыліся ў нашым жыцці, складваем апісанні ў трохлітровы слоік... А потым, 31 снежня, дастаём з паліцы гэтую, напоўненую пазітывам, скарбонку, па чарзе выцягваем паперку за паперкай, у падрабязнасцях і здымках прыгадваем усё добрае, што адбылося за 365 дзён, смяёмся і шчыра дзякуем чарговаму пражытаму году.

Так атрымалася, што два апошнія ці не найлепшыя ў нашым жыцці. Толькі ўявіце: летась мы ўпершыню сталі бацькамі (а да таго было дзевяць месяцаў шчаслівага чакання і нараджэнне сына)... А сёлета ўлетку ў нас з'явілася яшчэ і цудоўная дачушка-хрэсніца...

Хлопчыка свайго мы захацелі назваць Тамашом. Імя гэтае не сказаць каб папулярнае ў сучасным свеце. А таму ніколі не забудземся, як хвалявaліся перад паходам у загс. Муж пераймаўся, што сына ў першым яго дакуменце — пасведчанні аб нараджэнні — не захочуць гэтак запісваць, скажуць, што няма такога імя. Каб даказаць, што ёсць, ён нават браў з сабою слоўнік беларускіх асабовых імён...

На шчасце, «дакумент» не спатрэбіўся: сына запісалі так, як мы і хацелі, без ніякіх пярэчанняў.

...А як жа ўсхваляваў, як уразіў нас абрад хрышчэння Івонкі! Яго правадзіў малады прыязны ксёндз у адным з віцебскіх касцёлаў, прычым на чыстацюткай беларускай мове і без ніякага афіцыёзу. У нас было адчуванне, што мы прыйшлі не ў храм, а ў дом да сваіх самых родных ці найбліжэйшых сяброў. Ксёндз шмат гаварыў пра важнасць духоўных рэчаў, пра адказную місію хросных бацькоў. І нават пажартаваў (ці суцешыў?), што яны зусім не для таго, каб дарыць сваім хрэснікам дарагія лімузіны...

Да ўсяго і толькі потым мы даведаліся, што абрад хрышчэння праводзіцца ў тым касцёле бясплатна. Сям'я, калі ёсць такая магчымасць, можа проста ахвяраваць нейкую суму на развіццё храма. Як па мне, дык гэта вельмі правільна, бо дастатак у маладых бацькоў з малымі дзецьмі бывае розны.

...Сям'я, у якой выхоўваецца наша хрэсніца, двухмоўная. Старэйшы брацік Івонкі падтрымлівае тату і з нараджэння больш гаворыць па-руску. А вось сама Івона першым словам выдала «дзякуй». І гэта была такая мілата, што цяпер, каб падтрымаць дачушку, Сяргей таксама стараецца гаварыць па-беларуску.

Ва ўсю, без супынку, можна сказаць, размаўляе і наш сынок, праўда, не ўсё пакуль можна разабраць. Найлепш у яго атрымліваецца слова «тата». За дзень я чую яго нашмат часцей, чым інтэрнацыянальнае «мама». І радуюся нават больш за мужа, таму што гэта — па-нашаму, па-беларуску.

Таццяна Міхейчык, фота аўтара, *г. Мінск.*

«Гэта вам, — сказаў мужчына. — Проста так...»

...Халодным зімовым вечарам удзвюх з прыяцелькай мы ехалі з работы дамоў. Машына ў мяне старэнькая, капрызная, ёй, здараецца (і найчасцей — у сырое надвор'е) чхаць на мае «каманды» — яна возьме і стане. Можа — пасярод аўтатрасы.
Што я тады раблю? Ну вядома ж, выстаўляю аварыйны знак, бяру адвёртку, выходжу, адкрываю капот — пачынаю нешта круціць...

Той раз гэтую «вытворчасць рамонтных работ» вырашыла перанесці на ўзбочыну: удзвюх з прыяцелькай мы спіхнулі туды машыну, я стала калупацца ў халодным жалезе.

— Дзяўчаткі, вам дапамагчы? — раптам прагучала з джыпа, які спыніўся побач.

Я паціснула плячыма, маўляў, «хваробы» сваёй машыны ведаю, «лячыць» умею... Тады ў чым дапамагчы?

— Ну хіба ліхтарык патрымаць?

Пачуўшы гэта, мужчына засмяяўся, сказаў:

— Першы раз сустракаю жанчын, якія не шукаюць дапамогі — самі разбіраюцца ў тэхніцы.

— Дык жыццё, — кажу, — навучыла. І прывучыла...

Рухавік тым часам і сапраўды завёўся... Я закрыла капот сваёй машыны і ўжо сабралася «даць газу», як раптам пасажырскія дзверцы адчыніліся і ў салоне з'явіўся... букет белых руж.

— Гэта вам, — сказаў мужчына. — Проста так.

...Хвілін з дзесяць я прыходзіла ў сябе: кветкі — а тым больш вось такія — мне дарылі... не ўспомню калі!

Гэта было крута! Гэта ўзняло мне настрой на цэлы вечар і нават потым на цэлы дзень.

Крыўдна толькі, што я нічога не ведаю пра таго мужчыну: не запомніла ні твар яго, ні нумар машыны, але ж раптам ён прачытае гэтыя радкі? Раптам пачуе мой шчыры дзякуй — за адзін з найсвятлейшых момантаў года.

Святлана Магілеўчык,
Бялыніцкі раён.

Каб не падвесці дырэктара

...У апошнія дні 2019-га і сапраўды самы час азірнуцца на пражытае, прыгадаць, чым жа запомніўся прамінулы год.

З роднымі, дзякаваць богу, усё было ў парадку: муж — пры мне, мы з ім адзначылі ізумруднае вяселле — 55-ю гадавіну сумеснага жыцця, дачка (яна медык па прафесіі) жыве з сям'ёй у Маскве, сын — настаўнік (у нас з ім гэта агульнае) — побач, у нашым райцэнтры.

Але ж пра сябе... З дзяцінства мне хацелася пісаць. У школе гэта былі вершы, сачыненні. Асобныя з іх настаўнікі зачытвалі перад класам, а дырэктар школы Іван Іванавіч Палтарацкі аднойчы нават сказаў, што я яго вельмі расчарую, калі не стану пісьменніцай.

Прызнаюся, мары такія ў мяне былі: пасля школы хацела паступаць на факультэт журналістыкі ці філалагічны, аднак на той час у нашым Віцебскім педагагічным інстытуце былі толькі два факультэты — фізіка-матэматычны і хіміка-біялагічны. А паехаць на вучобу ў іншы горад магчымасцяў не было: нас з братам мама гадавала адна (тата загінуў на фронце).

Такім чынам я стала настаўніцай хіміі і біялогіі, з гадамі — нават выдатнікам народнай асветы. А паралельна і амаль заўсёды — нешта пісала: вершы, замалёўкі, розныя артыкулы... Калі ж не стала мамы, з'явілася найвастрэйшая патрэба (ці нават абавязак!) напісаць пра ўсё, што мы — трое дзяцей — перажылі з ёй «пад немцамі» ў гады вайны. Я тады малая была, вельмі шмат чаго не разумела, але ж запомніла, нешта асэнсавала...

Вельмі рада, што дзякуючы найперш пісьменніку Валерыю Гапееву гэтыя ўспаміны выйшлі ў свет асобнай кніжачкай «Дзяцінства ў тумане вайны», што ўрыўкі з яе сёлета друкуюцца ў часопісе «Я на пенсии», і на маё імя прыходзяць вельмі цёплыя шчырыя лісты ад людзей, многія з якіх такія ж пакутнікі — дзеці вайны. А гэта значыць, што памяць пра яе па-ранейшаму і жывая, і вельмі балючая.

На пачатку года ў нашай Падсвільскай бібліятэцы (а напярэдадні ў Варапаеўскай) прайшла прэзентацыя яшчэ адной маёй кніжачкі «Хаджэнне за шчасцем». У яе ўвайшлі апавяданні, замалёўкі з жыцця, гумарэскі, якія друкаваліся ў часопісе «Вожык».

Апошнім часам працую над новай кнігай, якая будзе называцца «А званок працягвае звінець». Такім чынам я і сапраўды «раблюся» пісьменніцай (жарт), бо нельга ж падвесці дырэктара.

...Гэтаму 2019 году я ўдзячна і за новае знаёмства са «Звяздой». Аб тым, што ёсць такая газета, што яна, нягледзячы ні на што, па-ранейшаму не здраджвае роднай мове, я, вядома ж, ведала, многае чытала (помню, колькі захапленя выклікала кніга абразкоў Валянціны Доўнар «Праз каханне»!), але каб супрацоўнічаць...

Сёлета ў рубрыцы «Народ на провадзе!» выйшлі мае праўдзівыя гісторыі «Любачка», «Танцуй... Пакуль не замужам», «...Шакаладны пунш» ды іншыя, спадзяюся, далёка не апошнія, бо падпіску на «Звязду» я ўжо аформіла. Мы з мужам будзем чытаць яе і будзем пісаць. Я вельмі люблю беларускую мову і спадзяюся, што з дапамогай «Звязды» навучуся (а гэта, паверце, ніколі не позна) лепш пісаць на ёй, лепш размаўляць. Можа, нават прыгожа, як гэта робіць газета.

...Вось так. Нехта можа падумаць, што ў мяне ў гэтым годзе не было ніякіх праблем і непрыемнасцяў. Былі, на жаль. Але ж пра дрэннае сёння згадваць не хочацца: што перажылі, тое перажылі. Мне спадабаўся звяздоўскі гараскоп на заўтра (а мо, і на цэлы год?): «У аптымістаў усё будзе дрэнна, але яны не заўважаць гэтага. У песімістаў усё будзе добра, але ім усё роўна не спадабаецца».

Я па жыцці аптымістка.

Зоя Наваенка,
г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.

«...ДЫК ТРЫМАЙЦЕСЯ СВАІХ І ЖЫВІЦЕ ДОМА!»

У людзей майго пакалення, народжаных у першай палове альбо сярэдзіне 50-х мінулага стагоддзя, сустрэча новага года, 2020-га, не выклікае такой эйфарыі, як, напрыклад, чаканне 2000-га. Тады мы радаваліся пачатку новага тысячагоддзя. Цяпер жа (і многія, на жаль) — кожнаму пражытаму дню.

Прычына такіх вось змен у настроі ляжыць на паверхні — з узростам пагаршаецца здароўе, стакроць узрастае каштоўнасць жыцця.

Асабіста я зразумеў яе ў 2013-м, калі даведаўся, што хворы на анкалогію. Думкі з нагоды былі самыя цяжкія, прычым гэта быў не столькі страх, колькі адчуванне тупіку і безвыходнасці. Адразу ж з'явілася жаданне тэрмінова завяршыць свае галоўныя справы: дарабіць, дапісаць, дасказаць... А ўжо затым пачаўся пошук паратунку.

У маёй сітуацыі гэта было хірургічнае ўмяшанне, за якое я вельмі ўдзячны доктару Юрыю Рыгоравічу Цемахову. Ён ратаваў маё цела, а паралельна ж, як той казаў, гарэла душа. Адразу прыгадалася ўсё, што не так рабіў, не так казаў і разумеў, што вельмі позна пачуў мудрае: «И помнить следует о Боге не только лишь в конце дороги. Страшиться нужно с юных дней грядущей участи своей».

Хоць-нехаць, але мне прыйшлося прызнаць, што жыў не па-боску: лічыў сябе вернікам, аднак веры гэтай не было і на гарчычнае зернетка. Вось чаму зараз галоўны клопат (спадзяюся, не толькі мой і не толькі ў новым годзе) — пра чысціню душы і мацаванне духу, а яны ўжо, дасць бог, больш здаровым і зробяць цела.

...А зараз пра год мінулы. Галоўным *набыткам* свайго 2019-га лічу... iPad. Дзякуючы яму я атрымаў магчымасць слухаць найлепшыя тэатральныя пастаноўкі, гутаркі са знакамітымі людзьмі, пропаведзі рэлігійных дзеячаў і шмат чаго іншага (напрыклад, той зададзены блюз Бентана «А вы памятаеце?»).

Відовішчам года лічу другія Еўрапейскія гульні, за якімі меў шчасце назіраць: прыемна ўразіў і сам стадыён, і выступленне некаторых спартсменаў.

Самымі *памятнымі днямі* ў сыходзячым годзе былі дні адпачынку ў санаторыі «Ружанскі». Туды мы паехалі разам з жонкай і атрымалі магчымасць яшчэ раз пераканацца, што Беларусь можа годна арганізоўваць аздараўленне і адпачынак не толькі сваіх грамадзян, але і замежных. А калі б да гэтага ды больш прымальныя цэны... Добра было б. І трэба!

Восень апроч іншага парадавала нас грыбамі, а хор «Жыцень» (кіраўнік — мой зямляк, заслужаны дзеяч культуры Беларусі Леанід Ваўчок) — вялікім канцэртам у родных Смілавічах. Прызнаюся, што гэткай колькасці цудоўных беларускіх песень я не чуў ніколі, але ж яны, дзякуй богу, ёсць, і ўся зала ад іх была проста ў захапленні!

...Не сказаць, каб вялікая радасць, але ж таксама прыемна, што старэйшы ўнук, якому хутка 20, сёлета атрымаў правы на кіраванне машынай. А гэта значыць, у мяне з'явіліся надзеі, што ён калі-нікалі будзе падвозіць не толькі дзяўчат, але і бабулю з дзядулем.

Не можа не цешыць і тое, што Беларусь па-ранейшаму застаецца незалежнай краінай, што хваляванні, выкліканыя дамовай аб паглыбленай інтэграцыі з Расіяй, засталіся (я спадзяюся) толькі хваляваннямі, бо незалежнасць — гэта скарб, які нельга страціць, інакш нашчадкі проста не зразумеюць нас і ніколі не даруюць.

Тое ж можна сказаць пра яшчэ адзін скарб — родную мову, хоць многія, у тым ліку і чыноўнікі, як не ведалі яе ў першыя гады незалежнасці, так і не ведаюць, што ўскладняе камунікацыю і — як на мой погляд — крыўдзіць сапраўдных шчырых беларусаў.

...Што засмучала ў адыходзячым годзе? На жаль, стала менш на аднаго майго аднакласніка. Яўген Мар'янавіч Адуцкевіч (светлай памяці!) у горадзе Чэрвені стварыў першую гімназію і шмат гадоў узначальваў яе. Цудоўны быў чалавек: муж для жонкі, бацька для дзяцей, дзядуля для ўнукаў і выдатны настаўнік для вучняў.

...Вельмі хацелася б завяршыць гэтыя разважанні пра свой год нейкімі прыгожымі паэтычнымі радкамі аб тым, што не варта пераймацца з-за розных непрыемнасцяў ды нястачы, бо нехта недурны казаў, што здаровы жабрак шчаслівейшы за хворага караля. Таму галоўнае — паверце — не хварэць. А далей...

Радасць ходзіць не да ўсіх,
Што даўно вядома...
Дык трымайцеся сваіх
І жывіце дома!

Вячаслаў С.,
г. Смілавічы.

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.

«Столькі выдумкі ў народзе...» Добры жарт заўсёды ў модзе!

Як нараджаюцца традыцыі? Ды рэч вядомая: нешта робіцца першы раз, а потым як быццам і выбару няма — трэба вяртацца, рабіць яшчэ і яшчэ. Так атрымалася са звяздоўскім «...Народам на провадзе!», так — з конкурсам на лепшы подпіс да здымка. Чытачы (ці паверыце — гадоў з дваццаць ужо!) практыкуюцца: нешта прыдумляюць, дасылаюць у рэдакцыю... Лепшыя варыянты потым друкуюцца, аўтары найлепшых — узнагароджваюцца квартальнай падпіскай на «Звязду»... Усё, здавалася б, добра, адзінае...
Здымак друкуецца раней, пераможцы называюцца пазней...
І толькі ў апошнім нумары года «карцінка поўная». Усмешачку!

«ЁСЦЬ ІДЭЯ Ў ДЗЕЎКІ ВЕРЫ, ЯК ПРЫВАБІЦЬ КАВАЛЕРАЎ...»

Столькі выдумкі ў народзе...
Чыгункі — глядзіце — ў модзе!
Хто іх выкінуў учора,
Аж чарнее сёння з гора!
Я вось здымак разглядаю —
Толькі локці не кусаю:
Каб наперад моду знала,
Я б таксама шыкавала!
Ніна Кандрашонак,
г. Петрыкаў.

Зацікавіў дзевак новы
Невядомы быт вясковы.
А таму мінчанка Жанка
Не паненка ўжо — сялянка.
Ў кухні бачыць чыгуны:
Трэба, значыць, уцяпляцца,
А то вымерзнуць мазгі!
Віктар Сабалеўскі,
г. Узда.

Закарцела неяк Свеце
Зоркай стаць у інтэрнэце,
Ідэя фікс —
ні даць, ні ўзяць —
Болей лайкаў атрымаць.
Ёй, каб спраўдзіць
гэту мару,
Чыгунок і той да твару!
Наталля Шкут,
в. Прудок, Светлагорскі раён.

Можа, служаць як званы —
Каб склікаць людзей
на збор?
Можа — галаўны убор?
Мікалай Старых,
г. Гомель.

У каго «кацёл» не варыць,
Таму новенькі падараць...
Затаварылася крама —
Рознай можа быць
рэклама.
Валянціна Гудачкова,
г. Жыткавічы.

«ЛЮБІЦЬ ПЕЦЯ ШАШЛЫЧКІ, ПАЛЯНДВІЦУ, КУМПЯЧКІ...»

У загончыку Ігнат
Дрэсіруе парасят:
Пятачкі пазадзіраюць,
Па камандзе
падбягаюць...
На арэну павязе?
Ці...
быць салу-каўбасе?
Іна Алісевіч,
в. Мякаты, Уздзенскі раён.

У вясковым у двары —
Мытная застава.
Іншаземцы-вепрукі
Добра знаюць справу.
Як паедзеш каштаваць
З душамі аладкі,
То з кішэні даставай
Свінкам... шакаладкі.
Іван Сіманёнак,
г. Паставы.

«МЕСЦЫ ЁСЦЬ — З ДУРНОЮ СЛАВАЙ, ДЫ «РАЗУМНЫМ» — АБЫ СПЛАВАЦЬ...»

У працоўны час Мікіта
На прыроду вывез
«світу»:
Нехта смажыць
шашлычкі,
Нехта з вудай ля ракі,
Хтось падаўся у грыбы,
Хто — ўдваіх —
яшчэ куды...
А ў Мікіты нуль турботаў:
Спіць хлапец
і сушыць боты.
Мікалай Касмачэўскі,
г. Наваполацк.

— Ты, вятрыска, раскажы,
Дзе і з кім цяпер мужы?
— Ды пілі гарэлку, піва...
Як заўсёды, не хапіла...
Па дабаўку
па Віллі
Дружна ў краму паплылі,
І занесла малайцоў
Проста ў лапы пагранцоў.
Любоў Чыгрынава,
г. Мінск.

Кіроўца, едучы з работы,
Пад прыдарожныя кусты
Адкінуў гумавыя боты,
А мог — крый божа — капыты.
Карына Цануніна,
г. Вілейка.

Боты, што купіў Пятро,
Прапускаюць «аш два о».
А калі прамочыш ногі,
Няма лепшай дапамогі,
Чым «цэ два
аш пяць о аш».
Ды кіроўца — не алкаш.
І ДАІ «пасе» дарогі...
Значыць, трэба церці ногі.
Мікалай Старых,
г. Гомель.

«ЛЯ РАКІ НА ГЭТЫ РАЗ ЯСЬ ЗНАЙШОЎ... ПРОЦІВАГАЗ»

З прамзоны
ці не першы раз
На хутар выехаў Сярожа.
На твар надзеў процівагаз —
Азонам дыхаць ён не можа.
Наталля Шкут,
в. Прудок, Светлагорскі раён.

Той, хто любіць пахі лета
Ды хвароб баіцца,
Хай запомніць,
што вось гэтак
Можна бараніцца:
Усцягнуў процівагаз —
І гуляй, як дзікабраз.
Мікола Кісель,
г. Мінск.

Паглядзіце, ягамосці, —
Гэта з будучыні госці...
Стрэнеш недзе
ды сам-насам —
Каб не стаў заікам часам.
Валянціна Гудачкова,
г. Жыткавічы.

Не пабіла грады градам,
Не пужаў нажом бандыт...
Ясь застаўся з голым задам
Праз даляравы крэдыт.
Любоў Чыгрынава,
г. Мінск.

Ля ракі на гэты раз
Ясь знайшоў... процівагаз
І на кумпал свой надзеў...
Да сябе кіруе ў хлеў...
Кажа: «Ўсякая драбніца
Калі-небудзь ды згадзіцца...»
Ну а я зрабіў выснову:
Перад намі Плюшкін новы.
Мікалай Старых,
г. Гомель.

«З КІРМАШУ БЕЗ БАБЫ ДЗЕД ПРЫКАЦІЎ ДАДОМУ...»

Рэкс трымае
пад сакрэтам,
Што ляжыць у возе гэтым.
Можа, грошы,
можа, дровы
Пад пасцілкай
адмысловай...
Каб пажыць
хоць трохі ў шчасці,
Шмат спрабуючых украсці.
Сужэнцы Астроўскія,
г. Мінск.

«Жулік спец!»
ды «Жулік ас...»
«Жулік выцягне калгас!»
Спадзяваліся — дарма,
Бо й каня ужо няма!
...Цюцька
так бы не сказаў —
Не па ім маркоціцца:
Гаркне з воза сваё «гаў!»,
І хай Мурка носіцца.
Ніна Бурко,
в. Капланцы, Бярэзінскі раён.

Прыязджайце,
ягамосці,
У сядзібу
дзядзькі Косці!
Жыўнасць
розная
тут ёсць
Ды чысцюткае паветра.
І адна у горле «косць»:
А куды ж
схадзіць да ветру?
Любоў Чыгрынава,
г. Мінск.

Мурка з Жучкай
свайму дзедку
Памагалі цягнуць рэпку,
Сцераглі усё, што сеяў,
Ад мышэй і ад зладзеяў.
Вось і дзед перад зімою
Забірае іх з сабою —
Не кідае ў чыстым полі
Зімаваць адных на волі.
Мікалай Старых,
г. Гомель.

«МУЖ ЗВАНІЎ З КАМАНДЗІРОЎКІ, ШТО КУПІЎ САБЕ АБНОЎКІ...»

Пачала рамонт
кватэры —
Мігам зніклі кавалеры...
Ты ж —
як хочаш:
клей шпалеры,
Столь бялі
і вешай дзверы,
Мяняй плітку, унітаз...
Ці хаця б —
не засмучайся,
У аб'явы учытайся:
Можа, прыйдзе...
муж на час?
Валерый Гаўрыш,
г. Чавусы.

Маляра, красуню Леру,
Пакідаюць кавалеры.
Канстанцін пайшоў
да Танькі,
Бо яна працуе ў банку.
Павел —
у дакторкі Томы
(Тая носіць спірт
дадому).
Не злажылася
й з Антосем,—
Паху фарбы не выносіць.
Мікалай Старых,
г. Гомель.

Распышэлі
Тома з Грышам:
Мы сягоння
нуварышы,
Трэба нам такі палац,
Што не мела
нават знаць...
І муштруюць рабацяг:
Тут не гэтак,
там — не так.
Заганялі да знямогі:
Не дай божа свінням рогі!
Любоў Чыгрынава,
г. Мінск.

Муж званіў
з камандзіроўкі,
Што купіў сабе абноўкі...
Ёй жа
трэба столь бяліць,
А галовачка —
баліць:
Для каго
ён там прыбраўся?
Мо, крый божа,
закахаўся?
Што ён есць?
Дзе ляжа спаць?
Як дадому прычакаць?
Мікалай Касмачэўскі,
г. Наваполацк.

Скажу вам праўду,
не зманю:
З прывагай будзеш
і з прыплодам,
Калі в'етнамскую
свінню
Карміць цукеркамі
заўсёды.
Карына Цануніна,
г. Вілейка.

Паважаю я свіней,
Што ў маёй суседкі.
Бо не ў кожнага
з людзей
Чыстыя шкарпэткі.
Валерый Гаўрыш,
г. Чавусы.

Свінням гэткае пароды
Ў нас прастора
і выгоды:
Загародку ў двары
Ладзім мы,
гаспадары.
Каб з падворка
не ўцяклі,
Каб здаровымі былі:
Каб не чуць
і век не бачыць,
Што такое грып
свінячы!
Мікалай Касмачэўскі,
г. Наваполацк.

Апошні (у прыватнасці, сёлета) агляд конкурснай пошты і, адпаведна, здымак, да якога трэба прыдумаць подпіс, змешчаны 4 снежня. Даўната — многія з чытачоў ужо даслалі свае творы і творыкі. Многія, хочацца верыць, яшчэ дашлюць, бо конкурс, як вы зразумелі, будзе працягвацца (нічога ж не зробіш — традыцыя). А гэта значыць, што далучыцца да кагорты яго ўдзельнікаў (згадзіцеся: цуд якая кампанія, дзе многія ўжо знаёмыя — спісваюцца-стэлефаноўваюцца, нават сябруюць) аніколі не позна. Так што пішыце: варушыце мазгамі, варушыцеся самі! І тады мы сустрэнем не толькі 2020-ы, але і...

Адной з нашых адданых чытачак днямі споўніцца сто! Бяда ў чалавека: трэба пашпарт мяняць! Дык і ў вас хай большай не будзе!

...Што да «Звязды», то яна, як вы ведаеце, з 1917-га!

І пры гэтым па-ранейшаму прымае і кампліменты, і віншаванні накшталт (ад спадарыні Валянціны Гудачковай):

Не стамляйся ж ты, стогадовая!
Да людзей прыходзь заўжды
новая!

Бо з табою сіл прыбаўляецца,
Што задумаеш — атрымаецца!

Вось за гэта ўжо можна выпіць! І жыць далей — дасць бог, са «Звяздой»!

РАВЕСНІКІ

Якія яны, народжаныя ў новым стагоддзі, больш за тое — у новым тысячагоддзі? Мы, старэйшыя, насцярожана назіраючы, як яны становяцца дарослыя, стараемся іх зразумець, прыдумляем ім вобразныя назвы кшталту «пакаленне вялікага пальца», «пакаленне Z». Зайздросцім іх уменню прыстасавацца да ўсяго новага, спрабуем спасцігнуць іх «кліпавае мысленне». Нярэдка наракаем: яны не такія, як мы!

Так, яны не такія, як мы. Хоць бы таму, што яны не мы, яны нашы дзеці і ўнукі. І растуць яны добрымі людзьмі, за якіх не будзе сорамна, якімі можна ганарыцца. Узяць, напрыклад, ужо дарослых — тых, каму ў 2020-м спаўняецца дваццаць, чый узрост заўжды будзе супадаць з парадкавым нумарам года. Яны ўжо сказалі пра сябе не толькі ў краіне, але і ў свеце. У гэтай падборцы мы раскажам менавіта пра іх, равеснікаў XXI стагоддзя. Упэўненыя: толькі пра некаторых з многіх.

Галоўнае — верыць у цуды і сілу думкі

Праз некалькі месяцаў пасля Новага года лічбу ў сваім узросце з 19 зменіць на 20 і студэнтка сталічнага факультэта журналістыкі і карэспандэнт Белтэлерадыёкампаніі Анастасія Рудзкая. За гэты час яна мела нямала асабістых дасягненняў, знайшла прэстыжную, а галоўнае, любімую работу. А за апошні год стала «Чалавекам года журфака», «Вядучай года БДУ» і выйграла конкурс «Фестываль эстрады БДУ» ў намінацыі «канферанс».

Бацькі заўсёды казалі дачцэ: «Калі штосьці не зробіш, будзе горш не іншым, а табе». І Насця старалася іх не падводзіць. Падчас вучобы ў школе былі думкі паступаць і ў медыцынскі, і на юрыдычны... Але, у рэшце рэшт, дзяўчына выбрала журналістыку.

З усмешкай яна згадвае свой першы матэрыял: «Патэлефанавала ў рэдакцыю газеты, дзе далі заданне зрабіць апытанку мінакоў аб рабоце дворнікаў. Я з радасцю яго прыняла, але потым... забыла! Як зараз помню, што была зіма, катаюся на санках — і раптам успамінаю: «Матэрыял! Так і пайшла, з гэтай лядзянкай, у гарналыжным касцюме, распытваць баравічан. Пасля — за камп'ютар...»

Яе плённая праца і ўпэўненасць у сабе спачатку дазволілі стаць трэцяй сярод абітурыентаў пры паступленні. А ўжо ў канцы першага курса прывялі на кастынг у перадачу «ПІН_КОД», куды заўсёды шукаюць маладых і крэатыўных, і паспяхова прайшла яго. «Нам задавалі пытанні, накшталт «А як бы вы паводзілі сябе ў гэтай сітуацыі», «Якое выйсце знайшлі б з гэтай праблемы».., — успамінае студэнтка. Так яна пачала сумяшчаць вучобу з работай. Трошкі пазней стала рыхтаваць сюжэты і для перадачы «Добрай раніцы, Беларусь». Каб даведацца пра шматлікія прафесіі, пабывала ў розных амплуа: хакеісткі, снаўбардысткі, пажарнай...

Пра гэта карэспандэнтка расказвае з радасцю і бляскам у вачах. Бо яшчэ з дзяцінства, гледзячы тэлевізар, уяўляла сябе па той бок экрана і верыла, што будзе скараць самыя высокія вяршыні. Аднак сказаць, што работа даецца ёй лёгка, дзяўчына не можа. «За сюжэтам на тры-чатыры хвіліны стаіць вялізная работа, — адзначае яна. — Мы шукаем тэму, дамаўляемся з людзьмі, пішам сцэнарый. Потым трэба змантаваць адзнятае разам з тэхнічным рэдактарам, паставіць у эфір. А яшчэ ж трэба памятаць, што ў кожнай машыны, камеры — пэўны графік. І пад іх трэба падладжвацца...»

На мяжы дзесяцігоддзяў Насця можа падвесці вынік: за свае 19 было шмат нагод для гонару. І ва ўяўным спісе насупраць задач «вучоба» і «работа» пакуль можна паставіць тлустую птушачку. А вось загадваць на наступныя 20 гадоў яна не можа. Лепш убачыць, што атрымаецца на самай справе. Адзінае ведае дакладна: будзе свая сям'я, шчыра пабудаваная кар'ера, справа, якая прынясе задавальненне. «Самае галоўнае для мяне, — кажа студэнтка, — быць у моманце. На тым месцы, дзе адчуваеш сябе камфортна, і з тымі людзьмі, якія і павінны быць побач».

А вось планы на Навагоднюю ноч былі даўно. Яе, па традыцыі, правядзе з самымі блізкімі — мамай, татам, бабулямі і дзядулямі. У сям'і заўсёды пануе самая ўтульная і святочная атмасфера. 31 яны збіраюцца і разам гатуюць, накрываюць на стол, на якім ніколі не застаецца месца. А ў 12 пад бой курантаў ціха стаяць, а Анастасія думае пра самае лепшае, што абавязкова павінна спраўдзіцца ў новым годзе. Бо верыць у цуды і сілу думкі.

Юлія АДАМОВІЧ.
Фота з сацсетак гераіні.

Навагодні бліц:

— Што прыемней, дарыць, ці атрымліваць падарункі?

— Дарыць, канешне. Хоць і атрымліваць прыемна. Выберу абодва варыянты.

— Тры словы, з чым асацыруецца Новы год?

— Яркасць. Ежа. Шчасце.

— А як жа мандарыны?

— А ў мяне на іх алергія! І на цукеркі таксама. Гэта нават не сумна, я ўжо прывыкла.

— Некалькі слоў, якім будзе 2020-ы.

— Такім, якім я захачу; напоўненым толькі пазітыўнымі эмоцыямі; паспяховым; здаровым. Ой, не! Давайце здароўе паставім на першае месца. Бо без яго не будзе нічога.

«Так проста я са спортам не развітаюся»

Не сакрэт, што падчас пажару адлік часу зачастую ідзе на секунды. А жыцці людзей залежаць ад таго, наколькі ўмела і зладжана спрацуе ў экстрэмальнай сітуацыі разлік пажарных. Таму асаблівую ўвагу яны ўдзяляюць фізічнай падрыхтоўцы і спорту. Прычым незвычайнаму — пажарна-выратавальнаму.

Данііл ЛАМЕЙКУ 20 гадоў споўніцца ў 2020-м. Але ў паслужным спісе юнака ўжо значыцца работа прафесійным пажарным і вельмі паспяховыя выступленні на спартыўных спаборніцтвах. Але пра ўсё па парадку.

— Я пачаў займацца гэтым спортам, калі мне было шэсць год. Сур'ёзна ўцягнуўся, калі споўнілася дзесяць. Праўда, у дзяцінстве не думаў, што стану пажарным. Паступіў у машынабудаўнічы каледж, але пасля неяк перагарэў да гэтай справы. А вось цяга да прафесіі ратавальнікаў засталася.

Першыя крокі ў спорт Данііл зрабіў дзякуючы свайму бацьку Дзмітрыю. Ён трэніруе юнацкую зборную Беларусі па пажарна-выратавальным спорце.

— Да шэрагаў ратавальнікаў я далучыўся год таму. Спачатку шэсць месяцаў працаваў дыспетчарам, пасля перавёўся ў баявы разлік. Ці складана было спачатку? Насамрэч работа дыспетчара не такая простая, як гэта можа здацца. Пастаянны псіхалагічны ціск, калі ты разумееш, што ў любы момант можа зазваніць тэлефон, а на тым канцы дрота адбываецца бяда. А табе трэба быць заўжды напагатове, каб усё правільна пачуць, запісаць і зразумець. Але лічу, што такі досвед вельмі добры. Цяпер жа ў мяне графік просты — дзень я працую, на наступны некалькі гадзін прысвячаю трэніроўкам і пасля дзень адпачываю. На зборы нас, вядома, адпускаюць. Яны бываюць чатырыпяць разоў на год.

— Але менавіта як сумяшчаецца спорт са службай?

— Усяго ў пажарна-выратавальным спорце існуюць чатыры віды. Гэта стаметровая паласа з перашкодамі, пераадоленне штурмавой лесвіцы, баявое разгортванне і эстафета. Больш за ўсё мне падабаецца штурмавая лесвіца. З самага дзяцінства любіў па ёй лазіць. Узняцца па ёй можна на першы паверх, а калі трэба вышэй — проста перакідваць уручную. Выкарыстоўваецца яна і на баявых выездах.

Юнак яшчэ некалькі гадоў таму стаў майстрам спорту. У яго паслужным спісе — і ўзнагароды міжнародных спаборніцтваў.

— Наша каманда ўпершыню выйграла чэмпіянат свету ў 2014 годзе ў Чэхіі ва ўзроставай катэгорыі малодшай групы. Але памятаю, што на штурмавой лесвіцы заняў толькі дзясятае месца. Што і казаць, быў слабаваты фізічна. Пры гэтым істотная канкурэнцыя ніякіх шанцаў не давала. Я не здаваўся, працягваў трэніравацца. І вось у 2018-м у балгарскай Варне, дзе праходзіў чарговы чэмпіянат свету, я здабыў перамогу ў гэтай намінацыі.

Прычым адметна, што гэтая вяршыня скарылася Данііл Ламейку не першая. За два гады да таго шаснаццацігадовы юнак лепш за ўсіх на планетарным спаборніцтве прабег стаметроўку з перашкодамі. Прычым бар'еры ў вышыню дасягалі двух метраў, а яшчэ трэба было прабегчы па бервяне і спусціцца з яго па нязручнай лесвіцы.

— Мой рэкорд — 16,05 секунды. Але сусветны — 14,85. Ёсць да чаго імкнуцца! Тым больш што ў нашай справе трэба сябраваць з кожным відам спорту.

Але ці ўсім можна займацца пажарна-выратавальным спортам?

— Паспрабаваць свае сілы можа кожны. Галоўнае — мець жаданне, цярпенне, імкненне. І тады пры наяўнасці фізічных даных можна будзе дасягнуць вынікаў. У звычайным жыцці гэта цудоўнае хобі, дзякуючы якому вы падцягнеце фізічную падрыхтоўку, выпрацуеце дыскцыпліну. Тут можна знайсці новых сяброў. Але і траўму можна атрымаць вельмі лёгка — дастаткова ўсяго аднаго памылковага руху.

На пытанне, якім юнак бачыць сябе праз пяць гадоў, Данііл адказаў не адразу. Але ён цвёрда ведае, што так проста з пажарна-выратавальным спортам развітвацца не будзе. А пакуль што ён у свой вольны час рыхтуецца да чарговых рэспубліканскіх спаборніцтваў, якія пройдуць у сакавіку ў Барысаўскім раёне.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

СТАГОДДЗЯ

«Важны не вынік, а сам працэс»

Вікторыя КОЎЧЫК — курсантка чацвёртага курса крымінальна-выканаўчага факультэта Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў.

«Мой тата міліцыянер — для мяне прыклад. Ён хацеў, каб я працягнула дынастыю ў пагонах. Сама служба мяне таксама вабіла. Я па натуры рамантык, наглядзелася фільмаў аб праваахоўніках і захацела змагацца са злачыннасцю. Мары спраўджваюцца».

«Старанна вучылася ў школе, імкнулася паступіць у Акадэмію МУС. Дзяўчыне дастаткова цяжка трапіць сюды — высокі прахадны бал. У год майго паступлення ён складаў 346, у мяне быў 381. Я сярэбраны прызёр Рэспубліканскай алімпіяды па грамадазнаўстве».

«Спорт можа выратаваць ад дрэннага настрою, дапамагае забыцца на няўдачы. Спачатку фізічна мне было цяжка ў Акадэміі. Не прывыкла да такіх нагрузак. Але з часам настолькі палюбіла бег, трэнажорную залу, што сама здзіўляюся. Цікаўлюся таксама правільным харчаваннем».

«Прэзідэнцкую стыпендыю двойчы атрымлівала ў школе і ў Акадэміі. Па выніках 2018/2019 навучальнага года стала «Найлепшым курсантам». Мэты такой не ставіла, неяк само выйшла *(усміхаецца)*. Галоўнае — заўсёды нешта рабіць. Не сядзець на месцы, развівацца. Працаздольнасць і ўменне канцэнтравацца на галоўным — адны са складнікаў поспеху. Удача таксама патрэбна! Таму не крыўдзіце яе».

«Усе мае ўзнагароды ў асобнай папцы захоўвае тата. Ён вельмі беражліва ставіцца да падобных дакументаў. Любіць заслугі дачкі паказваць гасцям. Для мяне ж важны не вынік, а сам працэс».

«Спяваю, скончыла курсы па вакале. Шмат чытаю, хаджу ў тэатр. Граю на фартэпіяна. Займаюся навуковай дзейнасцю. Навука — важная частка майго жыцця. Творчасць — справа выключна для душы. Я рэальна гляджу на рэчы. Другой Селін Дыён мне наўрад ці стаць» *(усміхаецца)*.

«Мне падабаецца камунікаваць з людзьмі. З нецярпеннем чакаю першага рабочага дня. На здзіўленне многіх, планую паехаць у невялічкі горад. Лічу, што менавіта там можна атрымаць бясцэнны прафесійны вопыт. Служыць буду ў структуры папраўчых установ».

«Дзяўчыне не месца ў міліцыі — састарэлы стэрэатып. Усё залежыць ад самога чалавека. Галоўнае, каб унутраныя задаткі дазвалялі і, вядома, было б жаданне. Я ведаю шмат жанчын, якія дабіліся вялікіх вынікаў па службе».

«Хацелася б, каб моладзь актыўней удзельнічала ў жыцці краіны. Іх ідэі, свежыя погляды, рашучасць і энтузіязм могуць многае! Добра, што дзяржава шмат увагі аддае рабоце з будучым пакаленнем, стварае неабходныя ўмовы для развіцця. Фінансавая падтрымка таксама важная».

«Каханне. Вось адно з маіх галоўных дасягненняў за дваццаць гадоў. Разважаю зараз выключна як дзяўчынка *(бянтэжыцца)*. У сучасным свеце цяжка знайсці свайго чалавека. Мне пашчасціла. Усё пачынаецца з сям'і. Будзе родны чалавек побач, будзе і работа, і кар'ера. Удваіх любыя горы скарыць можна! Упэўненая, усё самае цікавае яшчэ наперадзе».

Кацярына АСМЫКОВІЧ. Фота з асабістага архіва гераіні.

Насустрач будучыні

РОМАВЫ МАРЫ ПРА РОБАТАЎ

— Колькі сябе памятаю, заўсёды цягнула да праграмавання, — расказвае дваццацігадовы студэнт матэматычнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны Раман МІСАЧЭНКА. Трэцякурснік вучыцца па спецыяльнасці «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання», прадстаўляе праекты на рэспубліканскім узроўні і жадае быць карысным сваёй краіне. Але пра ўсё па парадку.

Яшчэ ў дзявятым класе, калі астатнія школьнікі сыходзілі пасля ўрокаў дадому, Рома «завісаў» у кабінеце інфарматыкі і паглыбляўся ў цікавы сусвет сімвалаў і лічбаў. Нават стварыў з аднакласнікам лакальную гульню...

— Аднак амбіцый для яе маштабавання не хапіла: адпачынак у бабулі аказаўся ў прыярытэце *(усміхаецца)*. Пазней, у дзясятым класе, стварыў анлайнавы складальнік тэстаў для настаўніка па матэматыцы, выступіў з ім на рэспубліканскім конкурсе «Камп'ютар. Адукацыя. Інтэрнэт». Тады і задумаўся ўсур'ёз над тым, каб стаць праграмістам, як старэйшы брат Ігар. Паступіў у ВНУ, адразу ж сабраў вакол сябе аднакурснікаў і сказаў: трэба ствараць нешта грандыёзнае. Спрачацца хлопцы не сталі, тым больш што ў мяне былі назапашаны пэўныя веды, каб падзяліцца імі з іншымі, — расказвае хлопец.

Сёлета разам з двума аднагрупнікамі Рома распрацаваў мабільны сэрвіс «Адукацыя».

— Лічу, што гэтая сфера — аснова развіцця нацыі, і добра, калі паняцце пра тое, што яна павінна змяшчаць і як выглядаць, трансфармуецца. У краіне ўжо выкарыстоўваюцца электронныя журналы і дзённікі, аднак наша прылада ўключае ў сябе штосьці большае: гэта і адзіны чат для абмеркавання розных тэм карыстальнікамі, і база адукацыйных навін горада (апавяшчэнні аб алімпіядах, конкурсах, канферэнцыях і іншым).

Зону адказнасці пры распрацоўцы праекта сябры падзялілі па магчымасцях і жаданні. Рома як аўтар займаўся большасцю працэсаў. Рэалізацыю пачалі ў рамках свайго факультэта. Зрабілі мабільныя версіі як на Android, так і на iOS, атрымалі станоўчыя водгукі ад студэнтаў і выкладчыкаў, а таксама пералік таго, што тым хацелася б дадаць. «Адукацыя» ўжо высока заявіла пра сябе на рэспубліканскім конкурсе «100 ідэй для Беларусі» і цяпер тэсціруецца ў адной з гомельскіх школ.

Нашаму герою ўдаецца быць лідарам па жыцці, падабаецца аб'ядноўваць кагосьці дзеля адной мэты і несці адказнасць за кожны свой крок.

— Пасля першага курса я пачаў зарабляць свае грошы, стаў незалежны ад бацькоў. Цяпер увесь вольны час імкнуся заняць чымсьці карысным, у асноўным ён сыходзіць на вывучэнне новых тэхналогій, моў праграмавання.

Дарэчы, сярод апошніх ідэй, якія плануе рэалізаваць у хуткім часе Рома, — аўтаматычны прыбіральшчык снегу. А галоўная мэта на найбліжэйшую будучыню — атрымаць месца ў паспяховай кампаніі ў якасці распрацоўшчыка робататэхнікі.

— Мяне цікавяць робаты, якія вызваляюць людзей ад руцінnай працы або могуць рабіць нейкія цікавыя, незвычайныя рэчы. Напрыклад, ратаваць людзей або лётаць у космас. Трапіць у парк высокіх тэхналогій таксама крута. Увогуле адчуваю сябе ў сваім узросце выдатна. Ёсць шмат магчымасцяў, і ўсё хочацца паспрабаваць рэалізаваць. Спадзяюся, што рухаюся ў правільным кірунку. Мару пра тое, што праз дзесяць, дваццаць гадоў я абавязкова буду ствараць штосьці крэатыўнае. Хачу быць наватарам, хачу быць карысным роднай зямлі.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Узлятаць і перамагаць

Пра Карыну Дзямідзік аматары спорту даведаліся і ўжо паспелі палюбіць яе пад дзявочым прозвішчам — Таранда. Беларуская скакуха ў вышыню, якая нарадзілася ў Баранавічах, у літаральным сэнсе слова ўварвалася ў сусветную эліту лёгкай атлетыкі. За свае 20 гадоў яна паспела «засвяціцца» на сусветных і еўрапейскіх п'едэсталах і некалькі разоў абнаўляла асабістыя і нацыянальныя рэкорды ў скачках у вышыню ў юніёрскай, маладзёжнай і дарослай катэгорыях. А ў 2020 годзе спартсменку чакае першая ў жыцці Алімпіяда.

Спорт Карына палюбіла з самага дзяцінства, аднак знайшла сябе ў лёгкай атлетыцы не адразу, перад ёй паспрабаваўшы акрабатыку, плаванне і валейбол.

— Трэнер па лёгкай атлетыцы хадзіла за мной некалькі гадоў, усё запрашала да сябе, а я не згаджалася, — расказвае Карына. — Потым прыйшла сама. У нас з ёй было вельмі шмат рознагалоссяў, было цяжка, нават не ведаю, чаму я засталася ў спорце. Было такое, што мяне выганялі. Былі і сур'ёзныя праблемы са здароўем — урачы казалі, што, калі буду займацца далей, стану інвалідам. А я ўсё роўна працягнула: трэніравалася сама — тады не разумела, дзеля чаго, але трэніравалася.

Такая ўпартасць не толькі захавала дзяўчыне здароўе, але і хутка прынесла поспех. Спачатку Карына стала сярэбраным прызёрам чэмпіянату Еўропы сярод юніёраў, затым чэмпіёнкай свету сярод юніёраў. А далей адкрыла перад сабой дзверы ў дарослы вялікі спорт, стаўшы фіналісткай кантынентальнага чэмпіянату ў Берліне ў 2018 годзе, чэмпіянату Еўропы ў памяшканнях у Глазга ў 2019 годзе і маладзёжнага чэмпіянату Еўропы. Сёлета на этапе Брыльянтавай лігі ў Лазане 20-гадовая Карына стала сярэбраным прызёрам, паўтарыўшы пры гэтым рэкорд Беларусі сярод дарослых, устаноўлены ў далёкім 1993 годзе, — 2,00 м. Акрамя таго, выканаўшы алімпійскі нарматыў, Дзямідзік заваявала ліцэнзію ў Токіа-2020 — гэта будзе першая Алімпіяда для Карыны.

Трэнер скакухі Валянцін Курдзюк, які стаў для спартсменкі амаль бацькам, запэўнівае, што два метры — гэта не мяжа для яго падапечнай. «Не магу сказаць, што ў Карыны звышданыя ад прыроды, але яна добра сфармаваная для скачкоў у вышыню і ў яе моцны характар. Карына вельмі прафесійна ставіцца да сваёй справы і цалкам дакладна ведае, да чаго імкнецца, таму дамагаецца выніку дзякуючы сплаву працавітасці і здольнасцяў».

Сама ж Карына адзначае, што вялікую ролю ў паспяховым выніку спартсмена адыгрывае псіхалогія.

— Чалавек сам не ведае, на што ён здольны. Яго магчымасці неабмежаваныя. Усе нашы абмежаванні — у галаве. Як ты псіхалагічна працуеш над сабой, як выхоўваеш свае думкі — так гэта адаб'ецца на тваіх поспехах у спорце.

Карына расказвае, што самае класнае ў яе відзе спорту — пачуццё палёту.

— Калі адрываешся ад зямлі, усё роўна як тэлепартуешся ў космас. А калі планка застаецца на месцы, то цябе ахоплівае неверагоднае захапленне. Гэта цяжка апісаць, гэта трэба паспрабаваць.

Аднак наколькі б каштоўны ні быў для Карыны спорт, яна адзначае, што гэта не адзінае, на чым засяроджана яе ўвага.

— Я стаўлюся да яго як да работы і хобі, цяпер ім жыву, але не скажу, што спорт — сэнс майго жыцця. У мяне і сям'я прысутнічае — калі раптам я скончу са спортам ці ў мяне не атрымаецца, не буду пакутаваць, таму што ёсць зусім іншае жыццё.

Сёлета, акрамя спартыўных поспехаў, у жыцці Карыны адбылася яшчэ адна значная падзея — дзяўчына выйшла замуж. Яе выбраннік часта бывае на спаборніцтвах разам з Карынай і падтрымлівае ва ўсіх жыццёвых сітуацыях. «Я шчаслівая, што нашы дарогі перапляліся ў адзін шлях, і, ідучы па ім крок за крокам, я атрымліваю асалоду ад жыцця!» — піша спартсменка пад здымкам з мужам у сваіх сацыяльных сетках.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

З верай у казку

ШТО ТРЭБА, КАБ ВЫКАНАЦЬ УСЕ ПАЖАДАННІ БЕЛАРУСАЎ?

Пра гэта ведаюць Дзед Мароз і яго жонка Матухна Зіма

Галоўны чараўнік краіны з Матухнай Зімой.

У сучасным свеце людзі ўсё менш стасункуюцца праз лісты, але да яго пошта прыходзіць штодня. «Звязда» з'ездзіла ў госці ў Белавежскую пушчу да галоўнага Дзеда Мароза краіны, дапамагла разабраць карэспандэнцыю і даведалася, пра што чараўніку пішуць дзеці і дарослыя.

КУФАР У СХОВІШЧЫ

Па прыездзе нас сустрэў сам Дзед Мароз з жонкай і запрасіў у яе майстэрню.

— Знаёмцеся, гэта — Матухна Зіма, а яшчэ ў нас ёсць тры дачкі: Сцюжа, Завіруха і Мяцеліца. Малодшая выйшла замуж за Снегавіка, і нарадзілася мая ўнучка — Снягурачка. Ведаеце, я адзіны Дзед Мароз, у якога ёсць сям'я, у калег з Расіі ці Украіны яе няма, а іх унучкі нарадзіліся са снегу і чараўніцтва.

Па дарозе да майстэрні мы даведаліся, што ўсе лісты і малюнкі пасля прагляду і адказу Дзеда Мароза трапляюць у бяздонны куфар у сховішчы. Ён з'явіўся там шаснаццаць гадоў таму, і ў ім больш за трыста тысяч пісьмаў.

— Яны да нас прыходзяць круглы год, падлічыць іх немагчыма — кажа Матухна Зіма, — пасля пятай тысячы збіваешся. Мы вызначаем колькасць па мяхах і скрынках. Вось толькі ўчора нам прынеслі пяць мяшкоў. Затое стараемся праводзіць падлік адпраўленых лістоў. Летась адказалі на сямнаццаць тысяч, і — паверце — гэта далёка не мяжа! Іх так шмат, што праглядаць усё ў сховішчы не атрымліваецца, таму ў маёй майстэрні зараз сапраўднае паштовае аддзяленне! Дарэчы, вось мы і прыйшлі.

ПАШТОВАЯ УНІЯ ДЗЕДАЎ МАРОЗАЎ

Зайшоўшы ў майстэрню Матухны Зімы, перш за ўсё мы ўбачылі мноства скрынак з лістамі. Дзед Мароз адразу папярэдзіў, што блытаць іх ні ў якім разе нельга і ўсё трэба класці на месца, бо ў кожнай скрынкі сваё прызначэнне.

— Вось тая, што злева, — гэта звароты без адраса адпраўлення, на такія мы, на жаль, не зможам адказаць. А на палічцы стаяць яшчэ з 2017 года, на якія па розных прычынах не змаглі напісаць адразу, і яны чакаюць сваёй чаргі. Ёсць у нас і асобная папка з лістамі з розных краін.

Такіх лістоў у Дзядулі Мароза сотні. Тайвань, В'етнам, Ганконг, Японія, Расія, Украіна... У маёнтку пабывалі турысты з 95 краін свету! Яны прыязджаюць, робяць фатаграфіі, расказваюць у сябе на радзіме пра падарожжа і пішуць у Белавежскую пушчу пажаданні.

— На жаль, ім я адказаць не магу, не палігот. Паток лістоў вельмі вялікі, таму Дзеды Марозы сёлета параіліся і вырашылі стварыць паштовую унію. Яна працуе вельмі проста: жаданне, якое трапіла да «чужога» Дзеда Мароза, аўтаматычна адпраўляецца ў патрэбную краіну. А для сувязі ў Дзедаў Марозаў ёсць спецыяльныя ёлачкі, якія служаць чароўнымі антэнамі.

ШТО ПРОСЯЦЬ?

У дзяцей сёння ў пашане канструктары «Лега». На другім месцы — тэлефоны і планшэты, следам ідуць робаты, лялечныя домікі, лялькі і цацкі ў выглядзе персанажаў з мультыкаў. Але ёсць і тыя, якія добры чараўнік адкладае ў асобны стос...

«ДЗЯДУЛЯ, ВЯРНІ ЎСЁ ЯК БЫЛО...»

— Часта дзеці просяць, каб бацькі перасталі піць, — кажа Дзядуля Мароз, — але вось адна дзяўчынка, якая летась пісала мне гэта пажаданне, сёлета даслала такое пісьмо: *«Дзед Мароз, вялікі дзякуй, што вы выканалі маё запаветнае жаданне. Наш тата больш не п'е, ходзіць злы як чорт, дзверцамі халадзільніка ляскае. Калі ласка, вярніце ўсё як было»*.

Карэспандэнт «Звязды» напісала на паштоўцы самае патаемнае...

ДЗІЦЯЧАЯ ЗАЙЗДРАСЦЬ

— А вось я літаральна ўчора прачытала не менш дзіўны ліст, — кажа яго жонка, — у ім адна дзяўчынка зайздросціць сваёй сястры ў прыёмнай сям'і: «Я моцна зайздрошчу Віцы, таму што яна ездзіць кожны год у Італію». Вось потым сядзі і думай, як правільна дзіцяці растлумачыць, што зайздрасць — гэта дрэнна. Бо мы не ведаем, чаму сястра ездзіць за мяжу, можа, яна вучыцца там або ведае мову, ёсць жа мноства прычын на гэта.

СЯБРА НЕ ПАДОРЫШ

Праглядаючы лісты, мы заўважылі, што мноства дзяцей просіць хатніх жывёл. Удакладняем у нашых герояў, як яны выходзяць з гэтай сітуацыі.

— У мяне быў выпадак, калі хлопчык пяты год кацянё загадваў, але свой запаветны падарунак так і не атрымліваў. Ніяк не магла зразумець, у чым рэч, — успамінае Матухна Зіма. — Я дзіцяці адказвала, што ў мяне каля майстэрні цэлых пяць, выбірай любога! Уяўляеце: кацянё ад Дзеда Мароза і Матухны Зімы?! А ён адмаўляецца! Аказалася, што ў мамы алергія на поўсць. Я яму тлумачыла, што так нельга: табе будзе добра, а маме дрэнна. Гэта я так разважала, а мой муж мудрэйшы за мяне, недарэмна на пяць тысяч гадоў старэйшы... Ён тлумачыць, што жывёла — гэта сябар, а падарыць сябра немагчыма!

Лісты ад дзяцей і дарослых прыходзяць штодня...

...разам з імі многія адпраўнікі дасылаюць свае малюнкі.

КОЖНЫ ЧАЛАВЕК — ЧАРАЎНІК!

Дзед Мароз не выконвае жаданняў, ён дае магчымасць самому чалавеку абудзіць у сабе добрага чараўніка. І дарослыя людзі, якія гэта разумеюць, пішуць яму вось такія лісты: «Прашу дапамогі ў Дзеда Мароза, хай усё складзецца так, як я хачу. Дай, Дзядуля Мароз, трошачкі цуду, дай трошачкі поспеху, дай сілы мне выканаць усё, што я хачу...»

— І ў іх усё атрымліваецца, — удакладняе чараўнік, — да мяне шмат такіх пісьмаў прыходзіць, вось вам яшчэ адно: «Гэта ўжо трэці мой ліст, які я перапісваю. Мінулыя два выкарыстоўвала як нагоду выгаварыцца, і ў мяне атрымалася. Дзякуй».

ЛІСТЫ АД БАБУЛЬ

— Вось у мяне ўчора было два лісты, я іх адкрыла запар, так атрымалася.

Яны ад бабуль, адной з якіх 90 гадоў! З іх 45 яна прапрацавала настаўніцай у школе і піша пра тое, што вышывае крыжыкам, уяўляеце?! І просіць у Дзеда Мароза набор для вышывання, ні на што не скардзячыся. А другой дзесьці 60—70 гадоў. Кім працавала гэтая, я не ведаю, але сам падыход зусім іншы. Суцэльныя скаргі, хоць яна нашмат маладзейшая. І ў падарунак просіць здароўя і апарат для вымярэння ціску.

— Такім людзям я тлумачу, што не мне пісаць трэба, а да доктара ісці, калі са здароўем бяда, — умешваецца дзядуля, — але калі акрамя мяне гэты апарат падарыць ніхто не зможа, то я ёй яго прывязу!

ЗВАНОК З МАЁНТКА

У «паштовых» скрынках знаходзяцца і такія лісты, на якія дзядуля не проста піша адказ, а асабіста тэлефануе на названы нумар. Вядома, такое здараецца нячаста, але сёлета ўжо было некалькі выпадкаў.

Адкрываем першы такі ліст і чытаем: «Дзед Мароз, зрабі, калі ласка, так, каб мяне на Новы год адпусцілі да мамы дадому. Ніяк нельга без мамы сустрэць Новы год».

— Гэтае пасланне мне напісаў непаўналетні падлетак з дзіцячай калоніі. Пасля яго пісьма следам прыйшоў ліст ад мамы з такой жа просьбай. Ну і што мне было рабіць? Я патэлефанаваў у калонію для непаўналетніх, прадставіўся, растлумачыў ім сітуацыю. Спачатку яны доўга смяяліся вынаходлівасці хлопчыка, а потым расказалі, які ён «добры», якія ў яго «подзвігі» на рахунку разам з мамай на пару.

«ПРАБАЧ, ШТО НЕ ВЕРЫЛА»

— Бывае такое, што людзі пішуць ліст і пачынаюць з фраз: «Не асабліва верыцца, што ты існуеш», або: «Я не веру». Адразу хочацца спытаць: дык навошта вы звяртаецеся, — абураецца Матухна Зіма.

— Я адзін раз патэлефанаваў дзяўчыне, якая ў пісьме прасіла дапамогі, а ў канцы напісала, што не вельмі ў мяне верыць. Яна так была здзіўленая маім учынкам, адчувалася, што ёй сорамна. Мы з ёй пагаварылі, і я растлумачыў, што нічога не споўніцца, калі няма жадання і веры, — пярэчыць Дзед Мароз.

ВЫКАНАННЕ МАР

— Часта госці, якія да нас прыязджаюць, пішуць свае пажаданні адразу на месцы або прывозяць іх з сабой. Для такіх выпадкаў сёлета ўстанавілі цудометр, — кажа Матухна Зіма і просіць Дзеда Мароза апавесці пра яго. — Гэта ж тваё вынаходніцтва, і так, як ты, пра яго не раскажа ніхто.

Дзядуля, які ўжо рыхтуецца прыняць першых у гэты дзень гасцей, спачатку бурчыць, што механізм цудометра сакрэтны, але потым здаецца і раскрывае таямніцы свайго вынаходства.

— Ён быў адкрыты сёмага снежня, да мяне прыехала яшчэ пяць маіх калег, і мы запусцілі яго ў дзеянне. Цудометр рэгіструе колькасць чароўнай энергіі,



якая змяшчаецца ў кожным дасланым лісце. Эмпірычным шляхам у лабараторных умовах было вызначана, што ў кожнай паштоўцы ўтрымліваецца ад 0,5 да 3 чароўных адзінак — кважэлаў, ад словазлучэння «квант желания». Энергія акумулюецца ў прыборы і ўначы Новага года расходуецца на выкананне ўсіх мар. Паводле здагадкі навукоўцаў, для таго каб выканаць усе жаданні беларусаў, прыбор да 31 снежня павінен назапасіць 99 999 кважэлаў.

— Тэорыя — гэта, вядома, добра, але лепш усё ўбачыць на свае вочы, — удакладняе Матухна Зіма і прапануе нам напісаць свой ліст і апусціць у цудометр. — Вось, трымайце паштоўку і пішыце самае патаемнае.

Як мы маглі адмовіцца ад такой прапановы?!

Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка III курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.
Фота аўтара.

Мінск — маёнтак Дзеда Мароза — Мінск.

Па старонках старых газет

ДЗЕЦЯМ ВЯРНУЛІ ЁЛКУ

«Вуліцы горада напярэдадні былі па-святочнаму ажыўлены. Дамы і клубы ўпрыгожваліся партрэтамі правадыроў у электрычным святле і зелені. Бойка гандлявалі прадуктовыя і прамтаварныя магазіны... Асаблівае ажыўленне наглядалася ў дзіцячых магазінах, ёлкі і цацкі купляліся нарасхват.

На фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі», у клубах металістаў і трыкатажнікаў адбываліся вялікія балы-маскарады. Рабочы калектыў завода сустрэчу Новага года адзначыў арганізацыяй стаханаўскіх сутак. Весела сустракалі Новы год дзеці. У Доме мастацкага выхавання дзяцей, у школах і дзіцячых садах былі арганізаваны навагоднія ёлкі. «Дзякуй Сталіну за вясёлае, радаснае жыццё», — усюды гэты лозунг гарэў яркім агнём электрычнасці. Кінатэатры, кафэ-рэстараны, клубы ў гэтыя дні былі перапоўнены...» («Звязда» за 3 студзеня 1936 года).

Так у 1936 годзе Новы год сустракалі ў Віцебску. Танцы, маскарады, святочныя вячэры, дзіцячыя ёлкі ў тую зіму гудзелі па ўсёй Беларусі. Менавіта з гэтага года свята набыло ўсенародны характар, а да таго яго лічылі буржуазнай забавай. Але і ў дарэвалюцыйныя часы Новы год не быў такі ўжо яскравы і шумны...

Святочнае меню

Пра тое, як адзначалі Новы год у пачатку XX стагоддзя, сведчаць афішы і рэкламныя аб'явы ў старых газетах. Напрыклад, у снежні 1912 года славуты мінскі «Акварыум» (ён размяшчаўся непадалёк ад сучаснай Кастрычніцкай плошчы) прапаноўваў канцэрты, разнастайныя забаўляльныя праграмы, а таксама навагоднюю вячэру з чатырох страў і келіха шампанскага. На першае — боршч ці булён з піражком, на другое — асятрына па-руску, на трэцяе — дзічына. І нарэшце, пламбір. Усё гэта задавальненне цягнула на рубель 75 капеек. Але канкурэнты з атэля «Нова-Маскоўскі» (які знаходзіўся на рагу Захар'еўскай і Губернатарскай) завабліваліі ў свой рэстаран «Фрыц». За чатыры святочныя стравы і келіх шампанскага тут бралі паўтара рубля, пры гэтым абяцалі дамам падарункі і сюрпрызы і «аркестр музыкі». Тыя ж, хто збіраўся святкаваць дома, маглі набыць шампанскае розных марак за 60 капеек і больш. Калі хто перабіраў сваю норму, можна было на наступны дзень звярнуцца ў аптэку па «кефір лячэбны». «Калі да рэвалюцыі ў нас, як і па ўсёй тэрыторыі Расійскай імперыі, Каляды адзначаліся 25 снежня, а Новы год 1 студзеня, атрымлівалася, што заканчваўся пост і на Новы год можна было ўжываць любыя стравы. Пасля таго як у 1918 годзе краіна перайшла на грыгарыянскі каляндар, Каляды па новым стылі перасунуліся на 7 студзеня, Новы год выпадаў на час паста, і ў веруючых з яго святкаваннем узніклі праблемы», — заўважыў краязнаўца Вадзім Зелянкоў на сустрэчы ў «Клубе гісторыі Мінска».

Першы «ўсенародны» Новы год.

За новы быт

Падшыўкі газет 20-х гадоў сведчаць, што новая ўлада абвясціла вайну ўсяму старому, нават святам. Пачынаюць ладзіцца «чырвоныя» вяселлі (у гэты час нават пярсцёнкі, як «буржуазны перажытак», не насілі). У снежаньскім нумары «Звязды» за 1924 год мне папаўся артыкул, дзе распісана, як адсвяткавалі акцябрыны (савецкая альтэрнатыва хрэсьбінам) маленькай Люцыі (Рэвалюцыі): «Замест таго каб несці дзіця ў царкву да папа, дамашняя работніца аддае яго грамадству, рабочаму класу, які і становіцца «хросным бацькам» дзіцяці... Новы член нашага грамадства будзе залічаны сёння ў члены саюза Нарпіт і членам групы «ваўчанят» арганізацыі «Спартак». Але ў гэтым жа нумары аўтары заяўляюць, што нельга абмяжоўвацца аднымі вяселлямі і «хрэсьбінамі» па-новаму, «трэба перабудаваць усе старыя формы жыцця, стварыць адну дружную сям'ю пралетарыяў. Гэтага можна дасягнуць толькі тады, калі мы створым рабочыя калектывы». Меркавалася, што такія калектывы будуць арандаваць дамы, арганізуюць пры кожным доме бібліятэкі, пакоі для гульняў і іншае. І пры гэтым тыя, хто зарабляе грошы, павінны будуць... утрымліваць сваіх беспрацоўных суседзяў (усё як у вялікай сям'і). Пачалася барацьба з рэлігіяй, дасталася і Калядам. У газетах друкаваліся артыкулы з заявамі, што «навука даказала, што бога няма», рабіўся аналіз біблейскіх тэкстаў са спасылкай на розныя гістарычныя крыніцы і з высновамі, што калядныя сюжэты — выдумка. Ладзіліся і антырэлігійныя святы. Напрыклад, у 1923 годзе ў Мінску прайшлі «камсамольскія святкі» з лекцыямі, «агітацыйнай п'есай» і антырэлігійным карнавалам. Паведамлялася, што «карнавал будзе асвятляцца сотнямі факелаў, бенгальскіх агнёў, на пляцоўках будуць жывыя малюнкі: пекла, рай, бог, збіцё немаўлят, нараджэнне рэвалюцыі і г. д. Увесь натоўп будзе ражаны і выступіць пад гукі аркестраў, камсамольскіх песень, калядных прыпевак, свісткоў, ражкоў і г. д.» Часта барацьбу з Калядамі падавалі як змаганне з п'янствам. Знайшлі тады і яшчэ адзін дзейсны спосаб, як пазбавіцца ад старых свят: у такія дні патрабавалі ўдарна працаваць, каб хутчэй набліжаць камунізм.

Куды схадзіць на святы, падказвала рэклама.

У газетах 20-х гадоў вы не знойдзеце ніякіх згадак пра Новы год, хіба што можна натрапіць на заметкі супраць несанкцыянаваных вырубак елак. Свята ціха адзначалася асобнымі грамадзянамі, а для дзяржавы яго не існавала...

Пакуль у газеце «Праўда» 28 снежня 1935 года не з'явілася публікацыя Паўла Постышава з прапановай вярнуць дзецям ёлку, маўляў, дарэмна аслявілі гэта свята як «буржуазную забаву».

Святу быць!

На артыкул у «Праўдзе» ў тыя часы рэакцыя магла быць толькі адна — «Будзе выканана!». Ужо праз пару дзён у Мінску гудзелі ёлачныя кірмашы. «Учора менскі трэст зялёнага будаўніцтва арганізаваў аправа сквера на Совецкай вуліцы продаж ёлак на Пляцы Волі, Віленскім скверы, Чэрвенскім рынку і ў самым трэсце. За дзень прадалі 500 ёлак. Значная частка пакупнікоў — рабочыя, служачыя, камандзіры. У вялікай колькасці закупляюць ёлкі арганізацыі», — дакладала «Звязда» 31 снежня 1935 года. 29 снежня ў Мінску адкрыўся вялікі міжраённы навагодні кірмаш. Калгаснікі прывезлі на кірмаш многа сельскагаспадарчых прадуктаў. За першыя два дні кірмашу калгаснікі прадалі на 220 000 рублёў мяса, малака, птушак, агародніны, фруктаў і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў. Народны камісарыят унутранага гандлю БССР нават пастанавіў 31 снежня на дзве гадзіны працягнуць работу ўсіх гастранамічных і прадуктовых магазінаў і абавязаў гандлюючыя арганізацыі забяспечыць магазіны дастатковай колькасцю і асартыментам харчовых прадуктаў і неабходнай колькасцю прадаўцоў для бесперабойнага гандлю.

На ёлках дзеці атрымлівалі падарункі.

Ужо 29—30 снежня арганізацыі рапартуюць, што ў школах, дзіцячых дамах і садках, у розных клубах і на кватэрах у рабочых па ўсёй Беларусі будуць ладзіцца ёлкі. Мінгандаль і Гарспажыўсаюз «падбіраюць цацкі і ласункі для дзяцей. Цацкі камплектуюцца ў спецыяльных скрынках». Наогул, у той год была арганізавана шыкоўная праграма для дзяцей на зімовыя канікулы (яны пачыналіся першага студзеня): спектаклі, прагляд фільмаў, канцэрты, сустрэчы з артыстамі, пісьменнікамі, вучонымі, лётчыкамі, інжынерамі, эстафеты на каньках і лыжах, касцюміраваны карнавал на катку на стадыёне «Дынама» ў Мінску, для дзяцей стаханаўцаў — паездкі ў Ленінград, Харкаў, дамы адпачынку...

Але як правесці святы, калі самі арганізатары ўпрыгожаныя ёлкі бачылі ў сваім маленстве хіба што праз шкло, назіраючы, як весяліліся дзеці ў багатых дамах? Таму 1 студзеня 1936 года «Звязда» друкуе артыкул Кандрата Крапівы з карыснымі парадамі. А ў наступныя гады будуць нават выдавацца цэлыя дапаможнікі з распісанымі праграмамі, тэкстамі вершаў і песень...

З газетных публікацый 1936 года даведваюся, як выглядалі першыя савецкія ёлкі: «Велізарныя пышныя дрэвы, якія верхавінамі краналіся столі, былі багата ўпрыгожаны. На ёлках «выраслі» яблыкі, цукеркі, пячэнне, розныя цацкі. Прыгожую ёлку зрабілі ў піянерскім атрадзе 4-га класа 5-й менскай школы. Яе галінкі абвівалі рознакаляровыя стужкі. Пазалочаныя арэхі, цацкі, ласункі, блёсткі ў святле рознакаляровых электрычных лямп надавалі ёлцы багаты выгляд. Вакол ёлкі дзеці вадзілі карагоды, пелі, пляслі, выступалі з нумарамі мастацкай самадзейнасці...

Ніз ёлкі ўслалі белай ватай, абсыпалі блёсткамі, у налітых вадой талерках плавалі лебедзі і рыбкі». Вельмі многія ёлкі ўпрыгожваліся партрэтамі правадыроў і лозунгамі.

Дарэчы, пра тое, чым упрыгожвалі навагоднія дрэвы, вялася гаворка і ў «Клубе гісторыі Мінска», Вадзім Зелянкоў пералічыў, якія пазіцыі былі ў прэйскуранце на цацкі сістэмы прамкааперацыі: кот у ботах, клоўн, гняздо, садавіна, Дзед Мароз, санкі, лыжнік, сумачка, барабан з цэлафанам, хлапушка папяровая залачоная, паўмесяц вялікі, рак кардонны, карова малая, яшчарка, вярблюд кардонны штампаваны, конь, рыбкі пазалочаныя і сярэбраныя, мядзведзь, муха, певень, ліхтарык, вінаград, груша, пражэктар ручны, жолуд з лісточкам, яечка з жалабком, самалёт, кавун фарбаваны, мядзведзь аксамітавы. Ён жа расказаў, як у тыя часы пошта спрабавала вырашаць праблемныя пытанні: Мінскі цэнтральны тэлеграф прапаноўваў грамадзянам і арганізацыям віншавальныя тэлеграмы адпраўляць загадзя за некалькі дзён з пазнакай «датэрмінова», каб пазбегнуць спазненняў у дастаўках. Гэтыя тэлеграмы абяцалі «ўручыць адрасату 31 снежня роўна ў 24 гадзіны».

Жыць стала весялей

Свята ладзілася не толькі для дзяцей. Першы Новы год у Беларусі адзначалі з асаблівым размахам — да традыцыйных зімовых спаборніцтваў, урачыстых адкрыццяў каткоў, спаборніцтваў мастацкай самадзейнасці, ударных стаханаўскіх змен дадаліся балі-маскарады і феерверкі. У Бабруйску «1600 стаханаўцаў, гаспадарнікаў, спецыялістаў, партыйных і прафсаюзных работнікаў прышлі 31 снежня ў памяшканне гарадскога тэатра на навагодні вечар-бал... Пад музыку двух аркестраў танцавала каля 500 пар». «У клубе імя Сталіна тысяча рабочых кандзіцерскай фабрыкі «Комунарка» ўсталі са сваіх месц і стройным хорам заспявалі «Інтэрнацыянал»... Файе клуба імя Сталіна пералівалася ўсімі колерамі вясёлкі. Рознакаляровыя шары ўздымаліся над галовамі людзей. Са столі густой сеткай звісалі чырвоныя, сінія, зялёныя і другіх колераў істужкі. Адзенне ўсіх пасыпала канфеці... Вось з'яўляецца работніца ў касцюме, на якім этыкеткі прадукцыі фабрыкі. На касцюме выдзяляецца яркі надпіс: «Жыць стала лепш, жыць стала весялей»... Касцюм і маска інжынера завода імя Кірава тав. Лапідуса былі аформлены на тэму «рост завода», сакратара комсамольскай арганізацыі тав. Гурвіча на тэму «фашызм». Рабочыя-кіраўцы спявалі і танцавалі пад музыку свайго заводскага джаза...» Так гудзеў Мінск. Дарэчы, 1 студзеня, пасля шумнай ночы, 500 работнікаў «Камунаркі» сабраліся ў паход у працівагазах да сваёй падшэфнай часці. Іншыя рабочыя ў гэты час выпраўляліся на партвучобу, лыжную эстафету ці ў кінатэатр, каб загадзя набыць білет на «новае дасягненне совецкай кінематаграфіі» — агучаны на рускай мове амерыканскага гукавога фільма па рамане Герберта Уэлса «Чалавек-невідзімка».

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Зімовыя канікулы 1936 года.

АДПУСКАЕМ ФАНТАЗІЮ...

і рыхтуемся да Новага года без надрыву, нават калі 31-га — рабочы дзень

Сёння ўсё больш людзей адмаўляецца сустракаць Новы год на «савецкі ўзор»: жанчыны не жадаюць некалькі гадзін праводзіць каля пліты, каб нагатаваць тазік аліўе, селядца пад футрам, салату з крабавых палачак, мяса па-французску, курыцу запечаную, заліўную рыбу, а потым стомлена сустракаць з роднымі Новы год. Замест гэтага людзі часцей сталі заказваць гатовую ежу ў рэстаранах і кавярнях, такім чынам вызваляючы час для сваіх родных і блізкіх. Карэспандэнты «Звязды» знайшлі некалькі лайфхакаў, або карысных парад, для тых, хто аддае перавагу хатнім стравам на навагоднім стале, але не гатовы ахвяраваць часам на іх прыгатаванне.

АТМАСФЕРА Ў ДОМЕ І ПАДАРУНКІ

Вядома, рыхтавацца да свята лепш загадзя, але калі ўсё нязробленае засталося на апошнія дні, то і тут не варта панікаваць і пераймацца. Аднак будзе не лішнім занесці ў спіс неабходных спраў такія пункты, як упрыгожванне дома, сервіроўка святочнага стала і падрыхтоўка падарункаў.

Пачаць варта з першага. Тут усё проста: навагодні вянок на дзверы — раз, бо гэты элемент стварае святочны настрой у кожнага, хто пераступае ваш парог. Другое — ёлачка, якая з'яўляецца, бадай што, галоўным сімвалам свята для кожнага з нас яшчэ з дзяцінства. Дарэчы, нават яго, гэты сімвал, можна пры жаданні зрабіць арыгінальным: з кніжак, з паштовак, з агеньчыкаў, развешаных на сцяне ў выглядзе ёлкі... Ну а калі ўпрыгожваеце яе саму — тут ужо раздолле для фантазіі і магчымасцяў кашалька. У адной нашай знаёмай, напрыклад, кожны год сярод упрыгажэнняў можна сустрэць папяровых снегавікоў, якіх яна са сваёй дачкой некалі зрабіла з дапамогай дзіцячага часопіса. І цяпер, якія б ні з'явіліся цацкі ў калекцыі, снегавічкі заўсёды нязменна застаюцца на пахучых галінках, а з імі і ўспаміны пра час сумеснай падрыхтоўкі да свята. Увогуле для ўпрыгожвання смела можна выбіраць цацкі, сняжынкі і гірлянды, зробленыя сваімі рукамі. Напрыклад, можна змайстраваць гірлянду з паштовак і вашых памятных фотаздымкаў за мінулы год.

Што датычыцца сервіроўкі святочнага стала, то тут увагі патрабуюць наступныя моманты. Перш за ўсё падлічыце, колькі гасцей збярэцца за ім, потым правядзіце рэвізію сталовых набораў, мэблі, каб недахоп месца за сталом альбо пошук відэльца з нажом не прымусіў разгубіцца вас і госця. Абрус, сурвэткі выбірайце, каб падкрэсліць атмасферу свята. Таксама ў гэтым дапамогуць свечкі на стале і навагодняя кампазіцыя, скажам, з упрыгожаных ёлачных галінак і шышак. І абавязкова знайдзіце час для падрыхтоўкі падарункаў. Добра, калі яны куплены загадзя, а ў апошні момант застанецца хіба што прыдумаць аздабленне.

Для ўпакоўкі падыдзе не толькі спецыяльная папера, але і тканіна, кавалкі шпалераў, старыя часопісы і газеты — словам, адпускайце фантазію на волю і тварыце. Пры гэтым памятайце, што галоўнае ў падарунку, каб ён прынёс станоўчыя эмоцыі свайму адрасату. У якасці прэзента лепш выбіраць нешта карыснае і сімвалічнае. Як варыянт, можна спячы прыгожае і смачнае імбірнае пячэнне альбо ўпрыгожыць слоічак духмянага варэння, якое прыгатавалі ўласнаручна летам. Альбо зрабіць скрынку з пажаданнямі на наступны год. Ці на крайні выпадак зазірніце ў найбліжэйшую краму і знайдзіце цікавыя прапановы ў выглядзе духмянай гарбаты, кавы, свечак, шакаладу... Не паспелі набыць — не хвалюйцеся. У любым выпадку самы лепшы падарунак — гэта тое, што ў навагоднюю ноч вашы родныя і блізкія збяруцца разам, каб пажадаць ад шчырага сэрца адно аднаму ўсяго самага лепшага і сагрэць абдымкамі і ўсмешкамі дарагіх людзей.

ХУТКА І СМАЧНА

Канешне, мара любой гаспадыні ці гаспадара (сёння мужчыны таксама любяць кухарыць) — гатаваць спакойна і пад любімую музыку. Але 31 снежня — рабочы дзень, і таму павольна не атрымаецца.

Па-першае, выбірайце правільныя рэцэпты, якія пералічваюць інгрэдыенты ў тым парадку, у якім яны выкарыстоўваюцца. Прасачыце, каб хапала ўсіх неабходных прадуктаў. Не плануйце занадта шмат страў — дастаткова прадумаць адзін «цвік праграмы», а астатняе меню дапоўніць лёгкімі закускамі. Не мудрыце з новымі рэцэптамі, выбірайце праверэныя і любімыя ўсімі дамачадцамі. Знайдзіце хвілінку, каб у думках «прайсціся» па тым, што вы гатуеце. Лепей зрабіць дакладны план дзеянняў: так стане ясней, з чаго пачаць, і ўсё пройдзе без мітусні.

Па-другое, падрыхтуйце бытавую тэхніку і нагрэйце духоўку, бо шматлікія рэцэпты пачынаюцца менавіта з гэтай парады. Таксама загадзя падрыхтуйце кухонны посуд і прыборы, якія спатрэбяцца, каб пасярод працэсу не лазіць па шафах і не шукаць неабходнае.

Тое самае зрабіце і з прадуктамі. Вазьміце вялікую міску і загрузіце яе, каб не адчыняць халадзільнік лішні раз.

Па-трэцяе, адвядзіце для смецця невялікі пакет, пастаўце яго непасрэдна на рабочую паверхню, каб выкідаць адходы адразу падчас гатавання. Гэта вельмі зручна, да таго ж вы зведзяце да мінімуму імавернасць пападання адходаў на кухонную падлогу.

Па-чацвёртае, карыстайцеся даўно вядомымі лайфхакамі — напрыклад, элементарным: каб вада закіпела хутчэй, накрывайце каструлю накрыўкай. І пасаліце ваду загадзя — гэта скароціць час чакання. Можна яшчэ падагрэць яе з дапамогай электрычнага чайніка.

Для прыгатавання страў наразайце прадукты на невялікія кавалачкі. Памятайце, што чым меншыя кавалачкі, тым хутчэй яны гатуюцца. Тонка нарэзаная курыная грудка будзе гатова за лічаныя хвіліны, у той час як тоўстая, неразрэзаная будзе выпякацца даўжэй.

Калі вырашылі самі прыгатаваць дэсерт, то ў рэцэптах выпечкі сярод інгрэдыентаў часта ўказваюць, напрыклад, размякчанае сметанковае масла. Каб вам не давялося доўга чакаць размякчэння, можна надзерці яго на тарцы.

БЫВАЙ, СТОМЛЕНАСЦЬ!

Калі вячэра гатова, самы час заняцца сабой. Нават калі да Новага года засталася гадзіна, гэтага хопіць, каб прывесці сябе ў форму.

Крок першы. Трэба «змыць» стомленасць. Сядзьце на дно ванны, скрыжаваўшы ногі па-турэцку, уключыце душ, заплюшчыце вочы і накіруйце моцны цёплы струмень вады на спіну, у месца паміж лапаткамі. Пасядзіце так 2-3 хвіліны. Цяпер вазьміце цвёрдую мачалку, нанясіце на яе некалькі кропель танізуючага гелю для душу і энергічна разатрыце цела. Абавязкова падстаўце пад струмень вады галаву, памасіруйце яе з бальзамам, потым спаласніце прахалоднай вадой. Гэтая працэдура мякка актывізуе пэўныя пункты, патрэбныя для «ажыўлення». Завяршыце экспрэс-абмыванне хуткім агульным кантрасным душам. Пасля актыўна разатрыце сябе ручніком і высушыце валасы фенам на самым халодным рэжыме.

Крок другі. Адразу пасля душу пратрыце твар любым свежаадціснутым фруктовым сокам, зялёнай гарбатай або тонікам ці лёдам з соку або гарбаты, прамакніце твар сурвэткай і нанясіце крэм, які падыходзіць для вашай скуры. Галоўнае, каб у ім утрымліваўся вітамін С, бо ён стымулюе кровазварот і паляпшае колер твару. Лёгкі пяціхвілінны масаж павялічыць танізуючы эфект крэму.

Крок трэці. Валасы — асноўны «індыкатар» стану: ператамленне, стрэс, дрэнны настрой робяць іх бляклымі і непаслухмянымі. Не трэба мучыць іх складанымі маніпуляцыямі. Спачатку пяць хвілін расчэсвайце валасы масажнай шчоткай па напрамку росту, затым — супраць, потым — зноў па напрамку росту і толькі потым рабіце ўкладку.

І апошні штрых — адзенне. Тут ужо лепш прытрымлівацца асабістага густу як мужчынам, так і жанчынам. Галоўнае, каб, гледзячы ў люстэрка, вы падабаліся сабе. І не забывайце пра ўсмешку. Паверце, яна дапаможа прыцягнуць у новым годзе шчасце і поспех!

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ, Алена ДРАПКО.

Песню бярыце з сабою...

ЗІМОВАЯ КАЗКА

Рубрыку вядзе Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com



Аляксей Пысін *(1920—1981) — выдатны беларускі паэт, перакладчык, дзіцячы пісьменнік, журналіст. Заслужаны работнік культуры БССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы за кнігу вершаў «Твае далоні». Член Саюза пісьменнікаў СССР.*

У час Вялікай Айчыннай вайны браў удзел у баях на Заходнім, Калінінскім, Ленінградскім, 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх франтах. Быў двойчы паранены. Узнагароджаны медалямі.

Аўтар зборнікаў «Наш дзень», «Сіні ранак», «Сонечная паводка», «Мае мерыдыяны», зборнікаў вершаў для дзяцей «Матылёчкі-матылі», «Вясёлка над плёсам», «Кавылёк», кніг вершаў і паэм «Колькі сонцаў», «Аляксей, Дзяніс, Алёнка» і іншых.

Віншуем усіх аматараў беларускай паэзіі і песні з Новым годам і Калядамі!

Словы — Аляксей ПЫСІН,
музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.

Куплет 1:
Птушыныя гнёзды пад снегам заснулі,
Дрымотную пражу завеі прадуць.
А хочаш — зімой закукуюць зязюлі,
Мядовыя росы на дол упадуць.

Прыпеў:
Я сам пажадаў сёння гэткага раю.
На беразе казкі зімовай стаю;
Прыгожае імя тваё паўтараю,
Насустрач любоў выклікаю тваю.

Куплет 2:
Дыханнем качу тваё імя па снезе,
Качу, нібы сонца, па белых лясах;
І падымаюць галовы мядзведзі,
Што спалі ў мядова-малінавых снах.

Прыпеў.

Куплет 3:
Дыхніце, мядзведзі, на просінь,
што свеціцца, —
Замёрзлае неба ужо адтае;
Ступае Вялікая ваша Мядзведзіца
У светлы маліннік на сцежкі свае.

Прыпеў.

ПРЫЙСЦІ НА ДАПАМОГУ

Страшная сітуацыя — выйсці на вуліцу або ехаць па дарозе і ўбачыць, што недзе гарыць дом. Але калі здавалася, што ўжо нічым не дапамагчы, знаходзіліся відавочцы падзей, якія як мага хутчэй беглі ў палаючыя дамы, каб выратаваць людзей, якія там знаходзіліся. Вашай увазе — некалькі гісторый са шчаслівым канцом, якія адбыліся сёлета ў нашай краіне.

«Вова гарыць!!!»

Драма разыгралася ўвечары 20 верасня ў адной з вёсак у Пухавіцкім раёне. На сваю дачу восеньскім вечарам пятніцы прыехалі муж і жонка з Мінска. І неяк мужчына заўважыў, як з-пад летняй страхі суседняга дома пачынае курыцца дымок...

Што было далей? Дамо слова герою нашага аповеда — Мікалаю Фярагу.

— Здарылася гэта ці то а пятай, ці то а шостай гадзіне. Верасень, рабіць на дачы асабліва няма чаго. І вось жонка прапанавала абабраць цыбулю. А рабіць мы гэта вырашылі на вуліцы. Ветру не было, ды і цягаць лішняе смецце з хаты нам не хацелася. Вось я і адправіўся па вядро цыбулі. І літаральна праз некалькі хвілін прыбягае да мяне ў хату жонка і крычыць: «Коля, Вова гарыць!!!» Уладзімір — гэта стрыечны брат маёй жонкі. Нашы дачы знаходзяцца па суседстве. Вось мы і пабеглі туды. Прычым басанож — нават не было часу абуцца.

Я ведаў, дзе ў доме стаіць ложак. Зайшоў туды — а праз дым бачнасць амаль нулявая. Навобмацак знайшоў ложак, сваяка і пачаў яго выцягваць на вуліцу. Тым часам на дапамогу падаспела жонка. Я ёй крычу: паглядзі, што тут гарыць, і, калі трэба, выключы спярша з разеткі. Выцягнуў я Уладзіміра на вуліцу, сам схапіў вядро, пабег у басейн па ваду. За гэты час жонка адключыла абагравальнік і тэлевізар. На шчасце, аднаго вядра вады хапіла. Адкрытага агню я не бачыў, але закурана была падушка, матрац пачаў тлець... Выйшаў я на вуліцу, абуўся, бачу: а свояк знік. Бягу назад у дом — а наш пацярпелы ляжыць на сваім ранейшым месцы, якое ледзь не стала для яго эшафотам. Ну што ж, з закуранай хаты пацягнулі назад на вуліцу яшчэ раз. Апаліў ён тады скуру на руцэ добра так... Тым часам падаспелі пляменнік з жонкай, якія і паехалі разам з ім на «хуткай».

«Згарэў тэлевізар, аплавіўся тэлефон...»

22 лістапада прыйшла прыемная вестка. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў медалём «За выратаванае жыццё» 23-гадовага сяржанта міліцыі Антона Сямякіна, які служыць у Дрыбінскім раённым аддзеле ўнутраных спраў. Ён выратаваў на пажары старога чалавека.

— Сам інцыдэнт адбыўся 8 красавіка, — згадвае **намеснік начальніка аддзела ўнутраных спраў па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні РАУС Міхаіл АКІНЧЫЦ.** — Паведамленне аб тым, што загарэўся дом у вёсцы Белая, прыйшло а шостай гадзіне раніцы. Трывогу ўзняў



сусед, які ўбачыў, што з вокнаў валіць дым. Ён патэлефанаваў на нумар 101, ну а адтуль дыспетчар перадаў інфармацыю ў нашу дзяжурную часць. Паселішча гэтае знаходзіцца прыблізна за 30 кіламетраў ад Дрыбіна. Там жыве некалькі нашых супрацоўнікаў. З імі мы і вырашылі звязацца. Вось да Антона першага і дазваніліся... Калі ён падбег да дома, то ўбачыў, што побач стаіць сусед, які і паведаміў пра пажар. Ён сказаў, што там, магчыма, унутры нехта ёсць. Антон зайшоў праз дзверы, унутры ўсё было, як у моцным тумане. І быў гаспадар, 71-гадовы дзядуля. Ён трымаўся за сцены ў зале ў шокавым стане. Антон вывеў небараку на вуліцу, і якраз у гэты час пад'ехалі пажарныя, якія і патушылі агонь у спальні. А ўзгаранне там было вельмі сур'ёзнае. Я пасля прыязджаў у гэты дом. Тэлевізар згарэў цалкам, моцна аплавіўся мабільны тэлефон...

«У акне стаяць пенсіянеры і крычаць немым голасам»

Увечары 23 жніўня ратавальнікам паступіла паведамленне пра тое, што гарыць прыватны дом у аграгарадку Калодзішчы, што знаходзіцца пад Мінскам. Калі пажарныя прыехалі на месца падзей, яны ўбачылі, што аднапавярховы драўляны дом гарыць адкрытым полымем. Але яшчэ да іх прыбыцця два браты вывелі з дома суджэнцаў-пенсіянераў, якія на момант пажару знаходзіліся ў доме.

— Мы ўвечары ехалі ад бабулі, дзе святкавалі яе дзень нараджэння, — расказвае Аляксандр Анціпаў. — Ехалі дадому да сябе разам з братам Яўгенам, дзецьмі, падвозілі маці... І вось Яўген здалёк заўважыў дым. Кажа: можа, крама гарыць? Вырашылі пад'ехаць бліжэй, паглядзець, што ж там адбываецца. А пасля павярнулі на адну з вуліц і ўбачылі, што гэта не крама гарыць, а франтон жылога дома. Карціна была жудасная: у акне стаяць пенсіянеры, крычаць немым голасам, шчоўкае ад агню шыфер, побач сабралося шмат дарослых людзей, падлеткаў, але ў дом не пайшоў ніхто. Баяліся яны ці што там... Разам з Яўгенам выбілі брамку, пасля — аконную шыбу і вывелі старых на вуліцу. Яшчэ б пара хвілін — і яны б згарэлі там. Вывесці іх праз уваходныя дзверы мы б не здолелі — яны былі адрэзаны агнём. Ды і ад дома мала што засталося: даху няма, столі няма, месцамі бярвенне прагарэла наскрозь.

Меркаваная прычына таго пажару — кароткае замыканне электраправодкі.

* * *

Зусім нядаўна, 20 снежня, у аграгарадку Сошна, што месціцца пад Пінскам, 27-гадовая дзяўчына вынесла з палаючага дома яго 69-гадовага гаспадара. Яна знайшла пенсіянера на ложку ў жылым пакоі. Паколькі пажар адбыўся ноччу, то агонь заўважылі толькі тады, калі ён ужо разгуляўся на поўную. У выніку полымя знішчыла дах, моцна пашкодзіла перакрыцці і маёмасць.

Аўтаномны пажарны апавяшчальнік дапамог выратаваць чалавека 26 лістапада ў Воранаўскім раёне Гродзенскай вобласці. А шостай гадзіне вечара паведамленне аб пажары паступіла на пульт ратавальнікам, але яшчэ да таго высветлілася, што гаспадара жылля выратаваў участковы інспектар капітан міліцыі Юрый Вількевіч. У гэты час ён якраз ішоў па вясковай вуліцы, калі пачуў гук ад працуючага апавяшчальніка. Дзверы былі незачыненыя, міліцыянер трапіў у дом лёгка. На печцы ён знайшоў гаспадара, які спаў. А на ім ужо тлела коўдра. Юрый Вількевіч зараз жа раскатурхаў небараку і вывеў яго на чыстае паветра, а ачаг агню заліў вядром вады.

...І з іншых стыхій

Першы лёд, які сёлета ўсталяваўся ў пачатку снежня, быў з-за слабых маразоў вельмі крохкі і нетрывалы. Разам з тым некаторых аматараў падлёднай рыбалкі гэтая акалічнасць не спыняла. Вось толькі стаўка пры такой бесклапотнасці — жыццё.

Па інфармацыі старшага інспектара Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Вольгі Нехарошых, а трэцяй гадзіне дня 8 снежня паступіла паведамленне аб тым, што ў затоцы Дняпра каля вёскі Палавінны Лог тонуць двое мужчын. Але яшчэ да прыбыцця ратавальнікаў відавочцы выцягнулі з вады 64-гадовага рыбака. Ён быў шпіталізаваны з дыягназам «агульнае пераахалоджанне». На жаль, яго 49-гадоваму напарніку

дапамагчы з берага было немагчыма. Яго пасля знайшлі на адлегласці 10 метраў ад берага без прыкмет жыцця.

У пачатку чэрвеня ў краіне стаяла анамальная спякота. Тысячы

людзей імкнуліся знайсці прахалоду каля вадаёмаў. Не стаў выключэннем і пляж на возеры Юбілейным у Гродне. У свой выхадны дзень туды адправіўся супрацоўнік Дэпартамента аховы сяржант міліцыі Аляксей Каратаеў. У нейкі момант ён пачуў крыкі і ўбачыў, што прыблізна за 70 метраў ад берага ў вадзе боўтаецца мужчына і кліча на дапамогу. Міліцыянер тут жа кінуўся ў ваду. Ён наблізіўся да небаракі, паспрабаваў яго супакоіць, а затым моцна схапіў яго і паплыў разам з ім да берага. Пасля мужчына растлумачыў, што хацеў пераплысці возера, але не разлічыў сілы і пачаў тануць...

Яшчэ адна гісторыя адбылася ў канцы верасня ў Пінску. Дзяўчынка выйшла на вуліцу разам з сабакам. Яна ішла да пляцоўкі, дзе звычайна выгульвала свайго чатырохлапага сябра, але... у цемры не заўважыла яму глыбінёй больш за тры метры. Яе выкапалі для дрэнажнай сістэмы. Дзяўчынка правалілася ў тую яму разам са сваім сабакам.

Праз некаторы час дадому са службы вяртаўся камандзір узвода роты міліцыі Пінскага аддзела Дэпартамента аховы капітан міліцыі Аляксандр Швец. Ён пачуў крыкі аб дапамозе, якія несліся аднекуль з-пад зямлі. Міліцыянер пайшоў на гук — і так знайшоў дзяўчынку разам з сабакам. Ён спусціўся ўніз і дапамог ёй вылезці наверх. А вось сабака моцна спалохаўся і не даваўся ў рукі чужынцу. Таму дзяўчынка пабегла дадому клікаць бацьку на дапамогу, а афіцэр застаўся разам з сабакам чакаць, пакуль яны вернуцца. Бацькі дзяўчынкі пасля прыйшлі ў аддзел Дэпартамента аховы і шчыра падзякавалі за дапамогу і неабыякавасць да тых, хто трапіў у бяду.

Як бачым, для таго каб дапамагчы іншаму чалавеку, часам неабавязкова валодаць навыкамі прафесійнага ратавальніка.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Інспектар ДАІ выратаваў жыццё... бяспраўніку

Гісторыя адбылася ў сакавіку. Старшы інспектар ДПС АДАІ Віцебскага РАУС капітан міліцыі Дзмітрый ЛАЗУКА заступіў на дзяжурства на трасе Віцебск — Лёзна. Раптам кіроўца снегаўборачнай машыны перадаў трывожнае паведамленне: каля адной з вёсак ляжыць перакулены аўтамабіль.

Інспектары адправіліся на месца здарэння. Пад'язджаючы да меркаванага месца, яны сустрэлі аўтамабіль дарожнікаў, якія і знайшлі легкавік. У кабіне разам з імі ехалі два маладыя хлопцы. Былі яны не вельмі цвярозыя і папрасілі іх падвезці. Аднак цікава, што «галасавалі» хлопцы непадалёк ад таго месца, дзе адбылася аварыя.

Адзін з іх быў увесь перамазаны крывёй. Але пры гэтым ран на яго целе не заўважалася.

— Міліцыянер спытаў, чыя гэта кроў і ці быў у іх кампаніі трэці — той, хто сядзеў за рулём машыны, якая патрапіла ў аварыю, — паведаміў **афіцыйны прадстаўнік УУС Віцебскага аблвыканкама Віталь САПРОНЕНКА.** — Хлопцы сталі актыўна адмаўляць свой удзел у ДТЗ і тое, што з імі быў нехта яшчэ.

Дзмітрый Лазука не паверыў словам і вырашыў знайсці кіроўцу, які, мяркуючы па ўсім, атрымаў сур'ёзныя траўмы. Афіцэр яшчэ раз уважліва агледзеў аўтамабіль і адправіўся шукаць яго ўладальніка. Інспектар аб'ехаў не адзін кіламетр мясцовых дарог і нарэшце заўважыў на адной з іх чалавека. Той ужо не мог самастойна рухацца. На галаве мужчыны была вялікая рана, якая сур'ёзна кроватачыла. Высветлілася, што гэта і быў той самы кіроўца, якога кінулі пасажыры. Ён вырашыў пакінуць месца ДТЗ. Праблукаў некалькі кіламетраў па дарогах і канчаткова страціў сілы...

Дзмітрый Лазука даставіў пацярпелага ў найбліжэйшую бальніцу. Медыкі здолелі яго выратаваць. А пасля расказалі інспектару: калі б ён знайшоў небараку-кіроўцу на некалькі хвілін пазней, то дапамагчы параненаму было б ужо немагчыма...

ЗОРКІ ГАВОРАЦЬ...

Ільвам давядзецца ўтаймаваць гонар, а Вадалівам — жыць на пазітыве

Год Белага Металічнага Пацука па ўсходнім календары пачнецца толькі 25 студзеня 2020 года. Але нездарма гаворыцца: «Уладкаваныя так людзі: жадаюць знаць, што будзе!», таму многія загадзя цікавяцца, у чым і як сустракаць гаспадара года, чым часціць і што падарыць, каб прыцягнуць удачу. Наступны год — высакосны, што некаторых палохае. Астролаг і нумаролаг Аліна ВОЛКАВА сцвярджае, што шчырым і адказным людзям турбавацца не трэба, і расказвае, да прадстаўнікоў якіх знакаў задыяка год абяцае быць асабліва спрыяльным.

«Гэта год, калі ўсё становіцца на свае месцы, — кажа астролаг, — пацук хоць і хітры, але разумны, не любіць агрэсіі і мае выдатную памяць як на злое, так і на добрае, таму калі не хочаце ў канцы года атрымаць непрыемныя ўзрушэнні, свары і нават разрыў адносін, будзьце шчырыя і больш цярпімыя, сейце тое, што хацелі б пажынаць».

АВЕН

Ад таго, як вы будзеце ставіцца да жыцця, залежыць многае, а самае галоўнае — ці выйдзеце вы пераможцам з непрадбачаных сітуацый, ці апыняцеся «на шчыце».

Жанчынам-Авенам будзе прасцей знаходзіць паразуменне з навакольнымі да канца вясны, а ўвосень вас можа ахапіць хандра і схільнасць бачыць усё ў чорным колеры. Мужчынам жа варта звярнуць увагу на кар'еру: перашкоды вас не спыняць, а толькі загартуюць, а ўменне аказваць і прымаць дапамогу прынясе прыемны вынік. Авенам наогул варта прыслухоўвацца да патрэб і меркаванняў блізкіх, брацца за праекты, якія маюць значэнне для грамадства. Год Пацука вельмі спрыяльны для пашырэння кола стасункаў, набыцця новых сяброў, карысных знаёмстваў і прыбаўкі ў сям'і. Пад канец года не забудзьцеся прайсці планавы медагляд, каб не прагледзець абвастрэнні хвароб.

ЦЯЛЕЦ

Як мінімум з сакавіка да кастрычніка ў Цяльцоў будзе атрымлівацца задуманае — але хто сказаў, што не спатрэбіцца прыкладваць намаганняў? Не вядзіцеся на спакусы і сумніўныя прапановы, дзейнічайце дакладна паводле рэцэпта, як геніяльны повар-пацук Рэмі з анімацыйнага фільма «Рататуй». Часам давядзецца адстойваць свае прынцыпы даволі жорстка, аднак вынік будзе таго варты. А вось у асабістых стасунках, наадварот, неабходна будзе навучыцца «чытаць» патрэбы і пачуцці партнёра, тады ўсё астатняе для вас стане лёгкае і простае.

Абавязкова знайдзіце час для адпачынку — блізка ці далёка, не важна, але ў прыемнай кампаніі. Гэта дазволіць аднавіць душэўныя сілы. Што да фізічных, тут усё проста і складана адначасова: здаровы лад жыцця і прафілактыка будуць мець лепшы вынік, чым кансультацыі самых выбітных свяцілаў і дарагія сучасныя лекі.

БЛІЗНЯТЫ

Памятаеце мышаня Джэры з серыі амерыканскіх мультфільмаў? Вось гэта і будзе ваш найлепшы талісман на 2020-ы, калі адкласці на бок шкоднасць, а пакінуць бурлівую энергію. Вы дастаткова доўга рэфлексавалі і вагаліся, цяпер час не баяцца, дзейнічаць, мяняць — сябе і свет вакол. Практычна ўвесь год поўны магчымасцяў так ці інакш праявіць разнастайныя здольнасці і таленты, нават тыя, пра якія вы самі цьмяна здагадваліся, дасягнуць каротка- і доўгатэрміновых мэт. Але запомніце: дэлегаваць паўнамоцтвы — метад не для вас, самі-самі-самі, ад пачатку да канца.

Перамены датычацца і асабістай сферы — калі, зразумела, вы таго жадаеце. У адзінокіх людзей вялікая імавернасць пазбавіцца гэтага статусу, знайсці палавінку ці блізкага сябра. Бліжэй да зімы парадуйце сябе водпускам, буйной пакупкай, культурнай або аздараўляльнай праграмай.

РАК

Ваша інтуіцыя і раней няблага працавала, а ў наступным годзе выйдзе на новы ўзровень. Прадчуванні дазволяць пазбегнуць многіх памылак, не дапусціць сварак з блізкімі, не ўвязацца ў заведама пройгрышную справу і, наадварот, падтрымаць таго, хто на першы погляд здаецца няўдачнікам, а ў выніку атрымае поспех. Карыстайцеся гэтай сваёй уласцівасцю, каб дапамагчы не толькі сабе, але і іншым — паверце, як сквапнасць, так і бескарыслівасць вернуцца ў трайным памеры.

Пацук падтрымлівае вашу схільнасць да стабільнасці, таму рэзкіх узлётаў у кар'еры альбо выйгрышаў у латарэі чакаць не варта, аднак некалькі важкіх «цаглінак» у пабудову вашага дабрабыту наступны год падкіне. І толькі ў адной сферы — адносінах з дзецьмі — трэба быць асцярожнымі, часцей паўтараць сабе: «Пераначуем — болей пачуем». Вазьміце на ўзбраенне вобраз мудрага пацука Сплінтэра, настаўніка чарапашак-ніндзя, і не спяшайцеся з высновамі і рашэннямі.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЛЕЎ

Год будзе досыць цяжкі — прынамсі ў параўнанні з папярэднімі, калі справы вырашаліся хутка і без напружання. Цяпер жа вам могуць прыпомніць старыя крыўды і злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі. Папярэднія памылкі, як, зрэшты, і высакародныя ўчынкі, у наступным годзе вернуцца бумерангам. Што рабіць? Змірыцца і падладзіцца пад абставіны, калі вы не можаце змяніць іх. Аўтарытарны стыль паводзін мусіць адысці на другі план. Ці помніце, што здарылася з пацуком у казцы пра Папялушку? Чараўніца ператварыла яго на пэўны час у кучара, не пытаючы, зразумела, пацучынага меркавання на гэты конт. Нешта падобнае чакае і вас. Калі выпрабаванне пройдзеце з годнасцю, можаце быць упэўненыя, што зорны апякун года заўважыць і ацэніць гэта.

У працаголікаў імаверныя больш частыя хваробы, асабліва прастуды і алергіі. Каб пазбегчы гэтага, прадстаўнікам знака рэкамендуецца часцей бавіць час з сям'ёй і блізкімі, яны — ваша галоўная «батарэйка» і крыніца радасці.

ДЗЕВА

Вашы перажыванні, працоўныя подзвігі і сямейныя клопаты будуць нарэшце ацэнены як след. Больш за тое, флёр шанцавання і гармоніі пашырыцца і на вашых блізкіх і сяброў, таму ў наступным годзе людзі пацягнуцца да вас, будуць прасіць дапамогі і не забываць аддзячыць. Але ж, як вы разумееце, нішто не бывае бясплатным, акрамя сыру ў пастцы. У вашым выпадку цаной можа стаць здароўе — часцей рабіце перапынкі, адпачывайце, вандруйце і аднаўляйце сілы (тыя, хто вас добра ведае, не западозраць у лайдацтве, а іншым і даказваць нічога не трэба).

2020 год спрыяльны для самаразвіцця. Курсы англійскай або ўрокі сальсы, каратэ або вышыванне, скандынаўская хада або жывапіс — дазвольце сабе заняцца даўнім хобі ці зусім новай справай. Фінансы будуць прыходзіць і сыходзіць нераўнамерна, таму не рабіце даўгоў, прытрымлівайцеся плана выдаткаў, як вы гэта ўмееце.

ШАЛІ

У першай палове года вас проста-такі будзе хлебам не кармі, а дай нарабіць глупстваў, пайсці на неапраўданую рызыку ці шакіраваць грамадскасць якім-небудзь экстравагантным учынкам. Паспрабуйце абмежавацца малым — змяніце прычоску ці гардэроб, а калі не атрымаецца, то не забывайцеся хоць выбачацца за ўсё незнарок сказанае ці ўчыненае, інакш рызыкуеце нажыць ворагаў.

На рабоце трэба зрабіць самае для вас цяжкае — вызначыцца. Прасоўванне па службе, але выхад з зоны камфорту (частыя камандзіроўкі, фінансавая адказнасць і г. д.) альбо спакойная, нават манатонная праца са значна меншай зарплатай? Змена сферы дзейнасці ці «стабільнасць — прыкмета майстэрства»? Усё залежыць толькі ад вашага жадання. Летам ці ўвосень чакаюцца вялікія выдаткі, якія кампенсуюцца толькі ў канцы года.

СКАРПІЁН

У 2020-м звычка пакідаць за сабой апошняе слова будзе вам моцна перашкаджаць. Не трэба крычаць пра свае ідэі на ўвесь свет і патрабаваць прызнання — спачатку зрабіце, а потым атрымлівайце пахвалу. І лепш, калі работа будзе не на асабістую выгаду, а на грамадскую карысць — напрыклад, як у гіганцкіх пацукоў гамбі, якія ў сябе на радзіме, у Афрыцы, дапамагаюць вайскоўцам у размініраванні.

Тое самае датычыцца сямейнага жыцця: калі вы гатовыя працаваць над сабой і чуць партнёра, блізкіх — шансы дасягнуць ладу ў доме павялічваюцца ў некалькі разоў. Цягам года вам выпадзе некалькі магчымасцяў істотна памяняць жыццё, аднак калі вы не зробіце гэтага да канца трэцяга квартала і працягнеце плыць па цячэнні, давядзецца адкласці яшчэ на некалькі гадоў. З фінансамі праблем не прадбачыцца.

СТРАЛЕЦ

Для вас гэта не самы прадукцыйны і пазітыўны год, але дасягнуць пэўных мэт, асабліва калі яны выразна акрэсленыя, а вы гатовыя змагацца з перашкодамі, усё ж атрымаецца. Рэкамендацый тут дзве: абавязкова ўзважвайце ўсе «за» і «супраць», а калі распачынаеце новую справу, даводзьце яе да канца.

Быць дыпламатычным — вось што ў 2020-м спатрэбіцца і прынясе плён. У асобных сітуацыях уменне пайсці на кампраміс стане, без перабольшання, лёсавызначальным. У другім паўгоддзі спатрэбіцца шмат працаваць, адшукваючы новыя крыніцы даходаў і заводзячы новыя сувязі. Калі справіцеся, Белы Пацук падкіне адчувальны бонус — магчыма, новае аўто, квадратныя метры альбо доўгачаканую паездку на мора.

КАЗЯРОГ

Вы не належыце да нахлебнікаў і абібокаў, таму неабходнасць папрацаваць як след наўрад ці вас палохае. Адзіная парада — пастарайцеся пазбягаць канфліктаў з калегамі. Вылучыцца на іх фоне яркай зоркай, канешне, можна, але ці вартая хвіліна славы таго, каб застацца з адкрытай спінай у адказны момант?

Калі ў вашых прыярытэтах — кар'ера, то не чакайце хуткага выніку, зарабляць рэпутацыю давядзецца доўга. Чым больш укладзяце энергіі, тым лягчэй будзе потым збіраць ураджай. Аднак не дазваляйце абяцанай узнагародзе засціць вам вочы, як гэта адбывалася з пацуком Рокі ў мультфільме пра Чыпа і Дэйла, — халодны розум і стратэгія хутчэй прывядуць да поспеху, чым гарачка і імпэт. Пад канец года самотныя Казярогі могуць сустрэць сваю палавінку — не выключана, што вы даўно знаёмыя, але ўбачыце адно аднаго ў іншым ракурсе.

ВАДАЛІЎ

Год на пазітыве — вось якім абяцае быць 2020-ты. Ваш талісман — бадай, самы знакаміты мыш Мікі Маус, у якога ўсё так ці інакш завяршаецца найлепшым чынам. Старайцеся не жыць мінулым — а некаторыя звычкі і знаёмствы давядзецца пакінуць у ім, каб рушыць наперад. Многае будзе залежаць ад асяродку, у якім вы знаходзіцеся, таму часцей бывайце з прыемнымі вам людзьмі ў тых месцах, дзе адчуваеце сябе спакойна і разняволена, альбо, наадварот, атрымліваеце зарад бадзёрасці і аптымізму.

У асабістых стасунках захоўвайце пазітыўную раўнавагу: часам вы будзеце памыляцца, як і кожны чалавек, часам будзеце мець стапрацэнтную рацыю, але не трэба ціснуць гэтым на блізкіх. Найлепшы спосаб справіцца з цяжкасцямі — паглядзець на іх з гумарам. І толькі фінансы будуць спяваць свае рамансы даволі няўпэўнена, таму кантралюйце выдаткі.

РЫБЫ

Значную частку года неабходна будзе працаваць над сабой — атрымліваць дадатковую адукацыю, набываць новыя ўменні, развіваць наяўныя здольнасці. Не прапусціце некалькі шанцаў, якія вам падорыць лёс з лютага да лістапада, але каб выбраць, які з іх рэальны, а які падманлівы, спатрэбіцца дапамога сяброў ці сваякоў — балазе мудрыя дарадцы сярод іх знойдуцца.

Увосень, калі будзеце аддаваць зашмат энергіі рабоце, магчымыя праблемы са здароўем, прычым з таго боку, на які вы і падумаць не маглі. Калі адчуеце нейкія трывожныя званочкі ў самаадчуванні, рэагуйце на іх адразу, і праблем удасца пазбегчы. Узімку магчымае папаўненне — як на грашовых рахунках, так і ў сям'і.

ЯК МЫ З ПАЦУКОМ ВАРАЖЫЛІ

«Звязда» спытала сімвал года, што нас чакае ў 2020-м. Адказ вас здзівіць

У канцы года многія не толькі падводзяць вынікі таго, што здарылася ці было зроблена за папярэднія 365 дзён, але і спрабуюць з дапамогай экспертаў здагадацца, якія перамены, лагічныя наступствы і суцэльныя неспадзяванкі чакаюць нас у блізкай будучыні. «Звязда» сёлета вырашыла таксама далучыцца да пераднавагодняй традыцыі, а на дапамогу паклікаць не каго-небудзь, а найгалоўнейшага эксперта па 2020 годзе — пацука!

Пакуты выбару

Кандыдатаў на гэту пачэсную місію, скажам шчыра, было з каго выбраць. Напрыклад, жывы сімвал наступнага года афіцыйна абралі ў Гродне — цёмнашэрую, пароды рэкс, вельмі дружалюбную да людзей пацучыху Гаечку. У Віцебскім заалагічным парку сярод грызуноў ёсць пацукі, шыншыла ды сурок, у Магілёўскім заасадзе, што ў Буйнічах, з усяго атраду толькі вавёрка, дый у Белавежскай пушчы лясны заапарк — гэта дэманстрацыйныя вальеры з дзікімі жывёламі і птушкамі, тут патрэбнай нам зубатай драбязы няма. Затое ў сталічным заапарку, які, дарэчы, сёлета адзначае 35-годдзе, атрад грызуноў прадстаўлены некалькімі тысячамі жывёлін: ад маленечкага афрыканскага мастоміса — «шматсасковай мышы», якая насамрэч ўяўляе сабой нешта сярэдняе паміж дзікай мышшу і пацуком, да самага буйнога прадстаўніка атрада — вадасвінкі капібары, якая дасягае метра і больш у даўжыню і можа важыць звыш 60 кілаграмаў. Таму вагаліся мы нядоўга і звярнуліся па дапамогу менавіта ў сталічны заапарк. «Паваражыць на будучыню з пацуком? А чаму б не! Прыходзьце, канешне», — пагадзіліся супрацоўнікі.

«Што б такое прыдумаць, каб было і цікава, і актуальна для многіх беларусаў — не загадваць жа абстрактнае шчасце і здароўе на ўсіх гуртам?» — раіліся мы з калегамі. Кожны прапаноўвае нешта сваё: «Папрасіце, каб візы адмянілі! — Каб мы «Еўрабачанне» выйгралі! Не, лепш «Оскар!» — Які «Оскар», вы што, тут бы ў спорце сваіх пазіцый не страціць. — Пра дабрабыт не забудзьцеся. — І пра культурна-гістарычныя каштоўнасці, ну не хлебам жа адзіным...» Пасля доўгіх спрэчак запісваем жаданні — атрымліваецца дзевяць

паперак. «Але ж наступны год высакосны, ад яго многія чакаюць узрушэнняў, а іх прадказваць неяк не хочацца, — нагадвае фатограф. — Можа, пакінем адну паперчыну пустой — на ўсякі выпадак?» Так і робім.

Грызуць усе

Нашым дарадцам і экскурсаводам па падземных лабірынтах стала **галоўны заатэхнік групы віварыя і экзатычных грызуноў Ірына ОРЛІС.** Яна працуе ў заапарку з моманту яго заснавання і ведае яго як свае пяць пальцаў. «Наш віварый лічыцца адным з найлепшых у СНД, — не без гонару заўважае Ірына Раманаўна, — хоць, безумоўна, даглядаць яго складана: каля 3000 грызуноў трэба штодня накарміць і агледзець, праверыць, як справы ў «радзільні» і «дзіцячым садку». Але асноўная задача супрацоўнікаў віварыя, як бы гэта ні шакіравала асабліва чуллівую аўдыторыю, — забяспечыць корм іншым насельнікам заапарка, у прыватнасці драпежным жывёлам і птушкам, якія ў прыродных умовах харчуюцца менавіта мышамі ды пацукамі. Таму тут адбываецца пастаянны кругаварот лабараторных мышэй і пацукоў: штомесяц 1,5-2 тысячы з іх ідзе на корм, але столькі ж нараджаецца, бо пацукі — адны з самых пладавітых грызуноў.

— Пацукі — як людзі, вельмі розныя, — паказвае нам заатэхнік сваю вялізную пісклявую, хвастатую і кіпцюрастую гаспадарку: мышэй, пацукоў, шыншыл, дэкаратыўных трусоў, нават сям'ю дзікабразаў, у якіх у лістападзе з'явілася папаўненне. — Бываюць тыя, каму галоўная радасць — як след паесці, бываюць пацукі-інтэлектуалы. Цікавая дэталь, якую заўважылі даследчыкі ў лабараторыях: пацукі, схільныя да алкагалізму, лепш навучаюцца... У мяне ў дзяцінстве, дарэчы, паколькі бацькі не дазвалялі трымаць сабаку, быў белы пацук Кентаўрык (напэўна, у сярэдзіне 70-х гадоў мінулага стагоддзя я была ці не першым «пацучатнікам» у Мінску). Пацук пражыў у мяне пяць гадоў, любіў сядзець на плячы, калі мы гулялі па горадзе, і... чыста выпадкова вывучыў каманду «Фас!». Я ж тады не ведала, як балюча кусаецца пацук, — і дзеля забавы казала на кагосьці з дамашніх: «Кентаўрык, фас!» — ён ціхенька падкрадваўся, кусаў і адразу кідаўся назад, мне на плячо — так працягвалася, пакуль нас строга не папярэдзілі, што наступны раз будзе апошні. Аднойчы я паехала ў турыстычную паездку на тыдзень, ён, мабыць, вельмі засумаваў і пачаў кусаць ужо ўсіх без разбору, акрамя мяне...

Следам знаёмімся з Венем, ён жа Веніямін — шасцімесячны беларморды пацук. «Яго выбралі для заняткаў у юнацкім гуртку, таму што, калі разглядалі ўсіх, Венечка сам падышоў і палез на рукі — выклікаўся добраахвотнікам. Праўда, ён не зусім чыстай пароды — у ідэале цёмны «капюшон» на пысе павінен заходзіць за вочы. Наогул нараджаюцца беламордыя спачатку цёмнымі, часцей за ўсё блакітнага колеру, — расказвае Ірына Раманаўна, пачэсваючы за вухам разамлелага героя, — але з узростам поўсць сівее, і паступова пацук становіцца практычна белы, толькі пара чорных валаскоў і чорныя мышыных у нас жыве не так шмат. Магчыма, падышоў бы яшчэ мяккашэрсны афрыканскі мастоміс, ну і розныя віды дэкаратыўных пацукоў. А вось звычайных, дамавых шэрых пацукоў вы ў нас не ўбачыце. Хоць і цяжка было перамагчы гэту навалу. Гадоў дзесяць таму яны «жылі» літаральна ва ўсіх вальерах, з'ядалі трусянят, бывала, птушанят з гнёздаў здымалі... Але паступова з дапамогай дэратызатараў мы справіліся: і з экзатарыума, і з тэрыторыі заапарка іх вынішчылі, хоць у Чыжоўцы шмат дзе пацукі бегаюць.

— Ці праўда, што ў пацукоў няма пародаў?

— Мой муж раней таксама казаў: «Яны ўсе ў цябе хамякі, толькі рознага памеру!» — смяецца Ірына Раманаўна. — Чаму ж, пароды ў пацукоў ёсць, проста парода прадугледжвае селекцыю, мэтанакіраванае развядзенне і падтрыманне набору пэўных прыкмет, стандартаў. У нас, напрыклад, ёсць пароды рэкс (у іх кучаравая поўсць. — **Аўт.**), сфінксы (амаль ці цалкам без поўсці, «голыя». — **Аўт.**), дамба (вылучаюцца нізка пасаджанымі і круглымі вялікімі вушкамі. — **Аўт.**), віліксы з мяккай поўсцю, ёсць сіямская афарбоўка, карычневая і рудая, нядаўна прывезлі турэцкіх — белых з чорнымі вачыма, перыядычна «праскокваюць» нават бясхвостыя — гэта, трэба сказаць, вялікая рэдкасць. Рэч у тым, што кожны ген, які адказвае за той ці іншы ўчастак і нават хваробу, цягне за сабой пэўную афарбоўку — «капюшон», «маску», плямкі, белы жывот і лапкі і г. д. Калі атрымліваецца цікавы вынік, яго пачынаюць замацоўваць — яшчэ ў савецкі час у нас прыжыліся «каўняровыя» пацукі, рудыя, блакітныя, беламордыя, апошнім часам мы прывозілі дамба і сфінксаў, а тут ужо, паколькі ёсць вялізны матэрыял, мы самі пачалі іх разводзіць. Самыя «пяшчотныя» — сфінксы, якія найчасцей хварэюць, асабліва на вочы, бо не абароненыя поўсцю.

Кіно з адкрытым фіналам

— Венечка, ідзі да нас! — спрабуем мы прыцягнуць увагу пацука, крыху пашаргатаўшы паперкамі. Аднак Веніяміну цікава літаральна ўсё навокал: стол, «звяздоўскія» календары (праўда, ніякаму канкрэтнаму месяцу перавагі ён не аддае, наразае колы па ўсёй паверхні), рукі заатэхніка, таму выбіраць штосьці адно ён не жадае, толькі насцярожана абнюхвае. Адна паперка ўсё ж прыцягвае ўвагу пацука — Веня чапляе прадказанне хвастом і сам здзіўлена аглядваецца: што тут у вас? Навыперадкі разгортваем яе...

Пустая! Гэта адзіная пустая паперка з усіх, якую сярод магчымых прыемнасцяў мы пакінулі на ўсякі выпадак... Веня, ты нам нагадаў невядомасць?!

— Мабыць, ён аціў фантастычнасць нашых пажаданняў, — расчаравана кажа фатограф.

— Маладзец, — смяюцца супрацоўніцы заапарка, — зняў з сябе адказнасць! І правільна зрабіў: ён жа такі маленькі, а ўбачыць будучыню для мільёнаў людзей — вялікая і цяжкая справа.

...У рэшце рэшт прыходзім да высновы, што белая паперка, якую выбраў Веніямін, — гэта зусім нават няблага. Бо кожны можа ўбачыць у гэтым выбары нешта для сябе: шанц пачаць з чыстага аркуша, «абнуліцца» і перапісаць сваю гісторыю нанова, адкрыць новыя далягляды, знайсці нешта схаванае, прыняць важнае рашэнне, ачысціцца ад непатрэбнага... А паводле Таро, напрыклад, пустая карта можа абазначаць як лёс, божую волю, так і адсутнасць канкрэтыкі, а яшчэ інфармацыю, якую чалавеку ведаць зарана, бо ён не гатовы адчуць і прыняць (гаворка не толькі пра непрыемнасці, але і пра нечаканую радасць). Словам, чысты аркуш — тая бязмежная прастора, сэнс і значэнне якой прыдумваем мы самі — і, кажуць, калі як след у яго паверыць, гэта спрацоўвае. Праверым у 2020-м?

Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Выказваем падзяку асветніцкаму аддзелу Мінскага заапарка за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу.

P. S. ***Пазнаёміцца бліжэй з сімваламі года, а таксама даведацца, якія пажаданні на наступны год мы загадалі, можна на сайце www.zviazda.by.***

ЦІ ВЕДАЛІ ВЫ, ШТО...

- *пацукі разумнейшыя за сабак і, з аднаго боку, добра паддаюцца дрэсіроўцы, а з другога, самі пралічваюць паводзіны чалавека і прадугледжваюць яго дзеянні, таму пацукоў цяжка адвадзіць ад дома;*
- *зубы пацукоў настолькі вострыя, а сківіцы моцныя, што яны могуць прагрызці нават жалеза і бетон! А яшчэ многія з іх любяць слабыя токі і таму каштуюць на зуб тэлефонны провад;*
- *пацукі таксама, як і людзі, бачаць сны;*
- *пацукі ўсяедныя, але аснову іх корму складае зерне, да якога трэба дадаваць кашы, мяса, агародніну. Солі ж і цукру, гэтаксама як вострых і тлустых страў, жывёлам даваць катэгарычна не трэба;*
- *пацук можа пралезці ў самую маленькую адтуліну, куды толькі пройдзе яго галава;*
- *калі пацук мые лапкамі пысу — гэта значыць, ён задумаўся альбо знаходзіцца ў разгубленасці, і актыўных дзеянняў ад яго чакаць не варта.*

СКАНВОРД



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Майстар. Ёлка. Нюня. Арлан. Ткач. Карал. Макака. Накал. Карась. Какаду. Тапчан. Бар. Рада. Атаман. Рак. Ларок. Арахіс. Таз. **Па вертыкалі:** Манака. Свята. Арфа. Лерка. Юнак. Кліка. Чмель. Рана. Арык. Асада. Каралі. Ананас. Абарот. Урук. Трата. Пчала. Ака.

Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, *г. Мінск.*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.29	16.57	7.28
Віцебск —	9.26	16.39	7.13
Магілёў —	9.19	16.46	7.27
Гомель —	9.07	16.52	7.45
Гродна —	9.42	17.13	7.31
Брэст —	9.34	17.22	7.48

Месяц

Маладзік 28 снежня. Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Зоі, Мадэста, Марка, Міхаіла, Сімяона.*
К. *Меланіі, Сільвестра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Вы адмыслова да нас прыйшлі ўладкоўвацца на работу ў снежні, каб бясплатна пажэрці на карпаратыве?..

Дзяўчатам і жанчынам. Мужык перад Новым годам палахлівы і асцярожны, як лань. У адносіны ўступае неахвотна, каб падарунак не дарыць.

— Мама, мама, ёлка гарыць!

— Сынок, не гарыць, а ззяе.

— Мама, мама, шторы ззяюць!

caricatura.ru

У сувязі са святам наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе 3 студзеня 2020 года.

Даты Падзеі Людзі

31 СНЕЖНЯ

У краіне

1854 год — нарадзіўся Пётр Уладзіміравіч Уладзіміраў, расійскі філолаг-славіст, гісторык літаратуры, доктар рускай славеснасці. Адзін з заснавальнікаў беларусазнаўства. Уладзіміраў выявіў новыя дакументы пра Скарыну, даволі поўна аднавіў яго біяграфію, прааналізаваў выданні, адзначыў іх асаблівасці, наватарства і значэнне для беларускай і ўсходнеславянскай культур.

1904 год — нарадзіўся Іван Дзянісавіч Варвашэня, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. У 1941—1943 гадах — сакратар Мінскага падпольнага абкама КП(б)Б і адначасова ў жніўні 1942-га — красавіку 1943-га — сакратар Слуцкага падпольнага міжрайкама КП(б)Б, камісар партызанскага злучэння Слуцкай зоны. З 1944 года — сакратар Мінскага абкама, з 1950-га — першы сакратар Мінскага гаркама КП(б)Б.

1909 год — нарадзіўся Юрый Давыдавіч Бяльзацкі, беларускі кампазітар, дырыжор, піяніст. Працаваў у Дзяржаўным джаз-аркестры Беларусі, быў канцэртмайстрам Белдзяржэстрады, мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам канцэртна-эстраднага аркестра Беларускага радыё.

1929 год — нарадзілася Марыя Ціханаўна Чайка, беларускі вучоны ў галіне фізіялогіі раслін, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар біялагічных навук. Распрацавала метадычныя прыёмы, якія выкарыстоўваюцца ў селекцыі і пры стварэнні экалагічна бяспечных тэхналогій, у прыватнасці інкрустацыі насення найважнейшых збожжавых культур, якія вырошчваюцца ў Беларусі.

1959 год — на Магілёўскім заводзе штучнага валакна атрымана першае штапельнае валакно.

У свеце

1514 год — нарадзіўся Андрэас Везалій, сярэднявечны навуковец. Заснавальнік сучаснай практычнай анатоміі. Адзін з першых стаў вывучаць чалавечы арганізм шляхам ускрыцця. Аўтар працы «Аб уладкаванні чалавечага цела».

1869 год — нарадзіўся Анры Эміль Бенуа Матыс, французскі мастак і скульптар, лідар плыні фавістаў. Вядомы сваімі пошукамі ў перадачы эмоцый праз колер і форму. Сярод найбольш вядомых палотнаў — «Танец», «Музыка», «Жанчына ў зялёным капелюшы», «Радасць быцця».

1917 год — дэкрэтам савецкага ўрада прызнана незалежнасць Фінляндыі.

1999 год — Барыс Ельцын выступіў днём па тэлебачанні з заявай, што ён пакідае пасаду Прэзідэнта Расіі. Выканаўцам абавязкаў кіраўніка краіны стаў Уладзімір Пуцін. У гэты ж дзень Злучаныя Штаты перадалі Панаме кіраванне Панамскім каналам і тэрыторыямі ваенных баз, якія з пачатку XX стагоддзя займалі амерыканскія войскі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 4278.

Нумар падпісаны ў 19.30 30 снежня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12